Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 МАЯ 2009 г. АЎТОРАК № 94 (26452)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

*Ідзе падпіска на II паўгоддзе 2009 года*

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **10600** | **31800** | **63600** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **9990** | **29970** | **59940** |
| **63858 (ведамасны)** | **17050** | **51150** | **102300** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **15550** | **46650** | **93300** |
| ***Да запатрабавання (праз газетныя кіёскі РУП «Белпошта»)*** | | | |
| **63850 (індывідуальны)** | **9460** | **28380** | **56760** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **8850** | **26550** | **53100** |
| **63858 (ведамасны)** | **14926** | **44778** | **89556** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **13639** | **40917** | **81834** |
| ***Да запатрабавання (праз кіёскі «Белсаюздруку»)*** | | | |
| **63850 (індывідуальны)** | **8410** | **25230** | **50460** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **7830** | **23490** | **46980** |
| **63858 (ведамасны)** | **11086** | **33258** | **66516** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **10525** | **31575** | **63150** |

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Сістэма дзяржпадтрымкі маладых талентаў даказала сваю эфектыўнасць»

**Аб гэтым заявіў 25 мая Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з адоранай моладдзю.**

Па традыцыі ў сталічным Палацы Рэспублікі ў апошнія дні навучальнага года кіраўнік дзяржавы ўручае адораным маладым людзям пасведчанні і нагрудныя знакі лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў, студэнтаў і таленавітай моладзі.

«Сёння мы можам з гордасцю сказаць, што беларуская зямля не бяднее на таленты, а сістэма дзяржаўнай падтрымкі маладога пакалення інтэлектуальнай і творчай эліты даказала сваю дзейснасць і эфектыўнасць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Аб гэтым сведчаць цудоўныя выступленні юных суайчыннікаў на самых прэстыжных спаборніцтвах. Мінулы год быў асабліва ўраджайным на поспехі і ўзнагароды, адзначыў кіраўнік дзяржавы. 33 беларускія школьнікі сталі пераможцамі міжнародных алімпіяд і прывезлі на радзіму 7 залатых, 14 сярэбраных і 12 бронзавых медалёў. З году ў год пашыраецца алімпіядны рух і ў самой Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларуская дзяржава па-ранейшаму аддае прыярытэт праграмам «Дзеці Беларусі», «Моладзь Беларусі» і «Маладыя таленты Беларусі». «Падрастаючае пакаленне мае магчымасць атрымліваць сучасную, якасную адукацыю, развіваць свае здольнасці і творчыя імкненні, паўнацэнна адпачываць. Мы будзем і далей рухацца ў такім напрамку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Для задавальнення пазнавальных інтарэсаў вучняў у кожнай гарадской і сельскай школе створана сетка факультатываў і гурткоў рознай накіраванасці. Найбольш здольныя атрымліваюць адукацыю ў 196 гімназіях і 33 ліцэях, для юных музыкантаў, мастакоў, артыстаў у краіне працуе больш як 500 дзіцячых школ мастацтваў.

Падтрымку адоранай моладзі аказваюць спецыяльныя фонды кіраўніка дзяржавы. Толькі ў мінулым годзе прэміі і стыпендыі фондаў атрымалі больш як 2 тыс. вучняў, студэнтаў і педагогаў, больш як 300 прадстаўнікоў творчай моладзі і 36 мастацкіх калектываў. У мінулым годзе Беларусь упершыню ў гісторыі прымала Маладзёжныя Дэльфійскія гульні дзяржаў — удзельніц СНД, папоўніўшы скарбонку 13 залатымі, 18 сярэбранымі і 14 бронзавымі медалямі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў паспяховае выступленне юнай спявачкі Хрысціны Святлічнай на міжнародным конкурсе «Дзіцячая Новая хваля-2008». Ён са шкадаваннем канстатаваў, што дарослыя выканаўцы пакуль не могуць паказаць на міжнародных конкурсах такія высокія вынікі, як юныя.

Нагадаўшы, што сустрэча праходзіць напярэдадні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Прэзідэнт, звяртаючыся да маладых людзей, адзначыў: «Вам, наследнікам пакалення пераможцаў, давераны вялікі і бясцэнны здабытак — моцная і незалежная краіна. Таму так важна стаць дастойнымі прадаўжальнікамі нашых слаўных традыцый, расці мужнымі, перакананымі патрыётамі, канкрэтнымі справамі пацвярджаючы любоў да роднай краіны».

Прэзідэнт пажадаў юным талентам, каб высокія ўзнагароды лаўрэатаў спецфондаў кіраўніка дзяржавы, уручаныя сёння, запалілі ў сэрцах імкненне да самаўдасканалення, пошуку новых шляхоў у навуцы і мастацтве. «Але не забывайце: у кожную вашу перамогу ўкладзены немалыя намаганні выкладчыкаў і бацькоў, і будзьце ўдзячныя ім за клопат, за ўрокі творчасці і майстэрства, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І самае галоўнае: помніце, што вы — беларусы. Любіце нашу цудоўную Радзіму, праслаўляйце яе сваім талентам».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў маладых людзей не растрачваць свае выдатныя таленты, актыўна працаваць і далей, быць адданымі любімай справе і цаніць галоўны рэсурс, адпушчаны кожнаму чалавеку, — час. З нагоды знамянальнай падзеі ў зале ўрачыстых цырымоній Палаца Рэспублікі адбыўся канцэрт з удзелам новых лаўрэатаў прэзідэнцкіх фондаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

«Прамая лінія»

## ДАПАМОГІ, ПЕНСІІ І ЛЬГОТЫ

Вынікам любых праблем у эканоміцы заўсёды становіцца павышаная цікавасць да сацыяльнай падтрымкі. А адсюль — і чарговая тэма нашай «прамой лініі». Пенсіі і сацыяльныя паслугі, ільготы і адрасная сацыяльная дапамога — пра ўсё гэта мы прапануем пагутарыць з **намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Вікенцьеўнай КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **3 чэрвеня з 11.00 да 12.30 па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па мінскім нумары 287 17 57.**




*Маладая мінская маці Святлана КАСАЧ з 4-месячнай дачкой Кацярынай на прагулцы па алеі з дэкаратыўнымі яблынямі.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## МЫ ЕДЗЕМ!

**Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела. І журналісты — ад падпіскі да падпіскі. Адно адрозненне — залікі-экзамены на год здаюцца двойчы, падпіска — ідзе штомесяц, штоквартальна разыгрываюцца і ўручаюцца каштоўныя прызы. Яны ж, як вядома, і дыктуюць маршруты маленькаму звяздоўскаму дэсанту.**

Чарговы — у сераду, 27 мая — праляжа праз Мар'іну Горку, Старыя Дарогі, Слуцк, Капыль, Узду... І нарэшце **ў 16 гадзін 30 хвілін у актавай зале СТАЎБЦОЎСКАГА райвыканкама** адбудзецца прэзентацыя газеты з уручэннем каляровага тэлевізара «Віцязь» Антону Іосіфавічу Шылюку, настольнага гадзінніка Ніне Уладзіміраўне Маркачэўскай з вёскі Горкі і фірмавай майкі з лагатыпам «Звязды» Вользе Рыгораўне Нікалаевай з вёскі Дзераўная.

Апроч гэтага ў праграме сустрэчы ўзаемныя знаёмствы, цікавыя расповеды, вершы і байкі са скарбонкі народнага гумару, віктарына... Карацей — прыходзьце.

**Звяздоўцы.**

## Серыю манет папоўніў «Леў»

**Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь з сённяшняга дня ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Леў» серыі «Знакі задыяка», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.**

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 28,28 г, у вачах льва ўстаўкі з сінтэтычнага крышталю, медна-нікелевая — намінал 1 рубель.

Манеты адчаканеныя на АТ «Манетны двор Польшчы»: сярэбраная — якасцю «анцыркулейтэд, аксідзіраваная», медна-нікелевая — якасцю «брыльянт-анцыркулейтэд». Тыраж сярэбранай манеты — да 25 000 штук, медна-нікелевай — 10 000 штук.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# СТОП, «КАМУНАЛКА»?

**Уплыў сусветнага крызісу на Беларусь аказаўся больш сур'ёзным, чым меркавалася яшчэ ў пачатку года — сведчаннем таму стала замаруджванне тэмпаў павелічэння ВУП. Разам з тым, у адрозненне ад многіх краін свету, айчынная эканоміка не спыніла свайго росту. Пры гэтым, як прагучала падчас Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях з удзелам прадстаўнікоў Урада, прафсаюзаў і аб'яднанняў наймальнікаў, сёння ніхто не адмаўляецца ад ранейшых сацыяльных гарантый і планаў па павышэнні зарплаты.**

### Эканоміка. Потым — зарплата

Як сведчыць статыстыка, у студзені—сакавіку намінальная налічаная зарплата ў цэлым па краіне ў параўнанні з аналагічным перыядам летась павялічылася на 19,5 %, і ў тым ліку ў бюджэтнай сферы — на 15,5 %. Пры гэтым рост рэальнай, з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі, зарплаты па эканоміцы склаў 3,6 %. На сярэдні заробак у сакавіку можна набыць больш за 2,5 мінімальнага «спажывецкага кошыка». І таксама адметны момант — **у Беларусі не ўзнікла вялікіх даўгоў па выплаце грошай работнікам.**

Такім чынам, **«абвалу» не адбылося.** Але ў той жа час сапраўды выпадае казаць аб некаторых праблемах. У прыватнасці, паводле слоў **намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Андрэя ЛУК'ЯНОВІЧА,** пакупніцкая вартасць сярэдняй зарплаты знізілася з 273 % мінімальнага спажывецкага бюджэту ў снежні да 253 % у сакавіку. Па-другое, застаюцца пытанні па «мінімалцы». Яшчэ ў 2005 годзе найменшы ўзровень аплаты працы ў Беларусі быў вызначаны ў бюджэт пражытковага мінімуму. Надалей з'явілася і іншая больш высокая мэта — паступовае набліжэнне да мінімальнага спажывецкага бюджэту. Разам з тым на сёння мінімальная зарплата аказалася ніжэйшай за БПМ. У гэтым плане на сёння сітуацыя ў нас горшая, чым у некаторых суседзяў па СНД — скажам, у Казахстане ці ва Украіне.

Па-трэцяе, яшчэ адна з'ява апошняга часу — **адмова банкаў выдаваць крэдыты прадпрыемствам на выплату зарплаты, прычым у тым ліку сумленным плацельшчыкам.** У сваю чаргу тут узнікае пагроза даўгоў па заробках. І ці не галоўнае. Сёлета, канстатуюць у прафсаюзах, тэмпы росту паказчыкаў аплаты працы адстаюць ад прагнозаў, якія на год вызначаны ў 31 % для намінальнай і ў 17 % — для рэальнай зарплаты.

Безумоўна, заробкі — заўсёды люстэрка эканомікі. Ужо ў снежні мінулага года былі зробленыя захады па падтрымцы ліквіднасці банкаўскай сістэмы, забеспячэнні стабільнасці работы валаўтваральных прадпрыемстваў, вызначаны план па лібералізацыі ўмоў гаспадарання. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы гэтаму Беларусі, у адрозненне ад большасці суседніх краін, удалося папярэдзіць падзенне. За І квартал аб'ём валавога ўнутранага прадукту склаў у бягучых цэнах 29 трлн рублёў і павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам летась на 1,1 %. Прычым за студзень—красавік гэты паказчык адпавядае 1,2, а, як чакаецца, па выніках пяці месяцаў ён выйдзе на адзнаку 1,4 %.

Такім чынам, можна казаць аб пэўным ажыўленні. Але адначасова — і аб цяжкасцях. Паводле слоў **першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра СЯМАШКІ,** па-сапраўднаму непрыемнай нечаканасцю апошняга часу стала... сур'ёзнае «закрыццё» традыцыйнага расійскага рынку. Насуперак усім дамоўленасцям, суседняя краіна распачала практыку лабіравання інтарэсаў уласных вытворцаў.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НАДВОР'Е

### ДАЖДЖЛІВА ТОЛЬКІ Ў ПЯТНІЦУ

**У першай палове тыдня чакаецца сонечнае і цёплае надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Толькі ў заходніх раёнах у сераду пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература ў аўторак 19—25, па паўднёвым захадзе да 27, у сераду ўначы 6—13, удзень 22—27. У чацвер месцамі, а ў пятніцу амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Пахаладае. У чацвер уначы 6—12, па паўднёвым усходзе да 16, удзень 12—18, па поўдні — 19—24. Удзень у пятніцу 13—20. Бліжэй да выхадных надвор'е палепшыцца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У «БЕЛАВІЯ» ЯШЧЭ АДЗІН «БОІНГ»

Як паведаміла вядучы спецыяліст камерцыйнай службы авіякампаніі Людміла Craновіч, раней гэтае паветранае судна эксплуатавалася кітайскай авіякампаніяй Air China. Самалёт разлічаны на перавозку 148 пасажыраў.

**Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».**

Фотафакт



*24 мая ў Мінску па вуліцы Кальварыйскай, 36 на былой тэрыторыі калоніі №1 адбылося буйное ўзгаранне скуразаменніка і будаўнічага смецця. Пажар за паўтары гадзіны ліквідавалі супрацоўнікі МНС. Агульная плошча узгарання склала 1200 кв.м. На пажары было задзейнічана 15 адзінак выратавальнай тэхнікі.*

**Ул. інф.**

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 5 ИЮНЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений в решение внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» от 03.12.2008 года.
3. Об утверждении Кодекса корпоративного управления Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 3 июня), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 5 июня) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней — до 3 июня 2009 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

УНП 100325912.

# У БЕЛАРУСЬ ПРЫЛЯЦЕЛА КНЯЗЁЎНА ЭЛЬЖБЕТА РАДЗІВІЛ!

## А разам з ёй — дзевяць прадстаўнікоў славутага роду



**Столькі князёў у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» яшчэ не бачылі! Таму і пастараліся, каб працэдура афармлення дакументаў заняла ўсяго некалькі хвілін. Фармальнасці, багаж — і вось 91-гадовая князёўна Эльжбета Радзівіл сядае ў шыкоўны «Мерседэс», а іншыя члены сям'і — ва ўтульны мікрааўтобус. З «Мерседэсам» звязаная цікавая гісторыя. Яго ласкава падаў для пані Эльжбеты Уладзімір Аляксеенка, уладальнік мінскага гандлёвага дома «Алекор». Мы разам з Уладзімірам Кірылавічам ужо сустракаліся з князёўнай у Варшаве, абмяркоўвалі дэталі візіту. Аляксеенка расказаў, што сам ён з Радзілімонтаў (маёнтак Радзівілаў пад Клецкам). Дамовіліся, што калі князёўна прыедзе ў Беларусь, «Мерседэс» Уладзіміра Кірылавіча будзе ў яе распараджэнні...**

— Якая цудоўная дарога! — адзначае князёўна Эльжбета. — Думаю, што ў Польшчы такіх няма. А як усё змянілася, як хараша наўкол!

Мінулы візіт князёўны Эльжбеты быў ажно ў 1993 годзе. Ад таго часу ў Беларусь прыязджалі асобныя прадстаўнікі роду, але такога — каб адразу дзесяць Радзівілаў наведалі родныя мясціны — напэўна, не было ад 1939 года! Таму і важна было арганізаваць гэты візіт. Падрыхтоўка да яго ішла некалькі месяцаў. Трэба было прадумаць усё: ад транспарту і гатэля да складнога крэселка на выпадак, калі князёўна стоміцца ў час экскурсіі.

Узровень візіту — хоць ён і прыватны — можна лёгка адчуць, зазірнуўшы ў спіс гасцей: гісторык, адзін з кіраўнікоў польскай чыгункі, высокі чыноўнік з польскага ўрада... Але цэнтральная асоба, безумоўна, князёўна Эльжбета. Фенаменальна, але яна — аднагодак газеты «Звязда»! Наша газета ўпершыню выйшла ў жніўні 1917 года, а праз 2 месяцы нарадзілася князёўна Радзівіл. Задумайцеся: пані Эльжбета — апошні чалавек у свеце, які жыў у Нясвіжскім замку, для каго замак быў родным домам!..

— Якая ў вас вялікая бібліятэка! Няўжо беларусы так любяць чытаць кніжкі?! — перапыняе мае роздумы князёўна.

Мы заязджаем у Мінск.

— Божа, колькі дрэваў, кветак, якія ахайныя і каляровыя дамы! А вось гэта, я памятаю, касцёл, а гэта — царква...

Размяшчэнне ў гатэлі, абед — і мы едзем на шпацыр па горадзе. Першы пункт — плошча Незалежнасці.

— Гэты касцёл збудаваў Вайніловіч, сябра майго бацькі, — кажа пані Эльжбета. — Яны часта прыязджалі да нас у Нясвіж, я таксама ездзіла з бацькам да іх у госці. Мінулы раз, калі я тут была, камуністы зрабілі з гэтага касцёла кінатэатр... Як добра, што храм вярнулі вернікам!

Спускаемся ў гандлёвы цэнтр «Сталіца». Паказваю князям Радзівілам краму «Радзівілаўскую».

— А чаму яна называецца «Радзівілаўская»?! — здзіўлена пытаецца князёўна.

— Таму што ў Беларусі ўсё радзівілаўскае! — ці то жартам, ці то сур'ёзна адказвае яе сын Аба. Аба — у гонар дзядулі, князя Альбрэхта Радзівіла.

— Цяпер я бачу, што Мінск — еўрапейскі горад, — аглядае пані Эльжбета гандлёвы цэнтр. — Бо вы маеце такія самыя крамы, як у Варшаве, Лондане, Рыме... Вой, якая мілая торба!..

Гэта мы падышлі да крамы з жаночымі сумкамі. Глядзім адну, другую, трэцюю...

— Я не памылілася, гэта сапраўды князёўна Радзівіл?! — вочы ў прадавачкі робяцца круглымі. — Я чытала з ёй інтэрв'ю ў газеце! Перакладзіце, што я выказваю ёй сваю павагу і гатовая зрабіць зніжку на любы тавар!

Пані Эльжбеце прыемна, што ў Мінску яе пазнаюць прадавачкі! Хоць, па вялікім рахунку, з князямі Радзівіламі так і павінна быць. Князёўна выбірае сумку, атрымлівае значную зніжку і задаволеная крочыць далей.

Глядзім помнік Міцкевічу (вельмі спадабаўся), Ратушу, Кафедральны касцёл, Святадухаў сабор. Князёўна заходзіць у храм і адзначае, як хараша спяваюць на хорах.

Вяртаемся ў гатэль. Назаўтра (у панядзелак) маем экскурсію ў рэзідэнцыю Радзівілаў Паланечка, найстарэйшы касцёл Беларусі ў Ішкалдзі і, натуральна, Мірскі замак.

— Гэта таксама мы збудавалі!.. — паміж справай зазначае князёўна Эльжбета Радзівіл.

Мы набліжаемся да Ішкалдзі. І я мушу высылаць гэты артыкул у рэдакцыю, каб ісці суправаджаць князёў. Працяг — у заўтрашняй «Звяздзе».

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

*(Працяг тэмы на 2-й стар.)*




Падпіска-2009

## У ПАДАРУНАК — ТЭЛЕВІЗАР...



*Каляровы тэлевізар «Віцязь» Мікалаю ЮРУЦЮ (злева) уручае начальнік аддзела ідэалагічнай работы Леанід КОЛБАСА.*

**Ляхавіцкі раён на карце Беларусі — далёка не самы вялікі, і пэўна, адыгрывае не самую першую скрыпку ў плане фінансава-эканамічнага развіцця краіны, аднак для газеты «Звязда» — гэта важны стратэгічны падпісны рэгіён.**

Традыцыйна тут вельмі шмат падпісчыкаў на найстарэйшае ў краіне, адзінае штодзённае беларускамоўнае выданне. А яшчэ, без сумненняў, жыхары Ляхаўшчыны — даволі азартныя людзі, бо актыўна высылаюць у газету квіткі аб удзеле ў штоквартальнай латарэі, у якім наша газета сярод сваіх падпісчыкаў разыгрывае нямала каштоўных прызоў. І як вынік — многім усміхаецца ўдача. У чарговы раз фартуна павярнулася тварам да «ветэрана» падпісной справы Мікалая Юруця...

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.05.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 749,00 |
| 1 еўра | 3 848,33 |
| 1 латвійскі лат | 5 417,28 |
| 1 літоўскі літ | 1 112,42 |
| 1 чэшская крона | 143,90 |
| 1 польскі злоты | 869,96 |
| 1 расійскі рубель | 88,53 |
| 1 украінская грыўня | 359,58 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў* — Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,0516 |
| 10 UAH | 40,5109 |
| 1000 BYR | 11,2915 |
| EUR | 43,4909 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

# Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена шасці грамадзянам краіны

**Адпаведнае распараджэнне кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 21 мая.**

За высокія паказчыкі ў службовай дзейнасці, прафесійнае майстэрства, праяўленае пры падрыхтоўцы і правядзенні сумеснага аператыўна-стратэгічнага камандна-штабнога вучэння «Бастыён — Антытэрор-2008», падзяка аб'яўлена начальніку аддзела воінскай часці 1250 пагранічнай службы маёру Сяргею Зубкову, афіцэру аддзела гэтай жа воінскай часці старшаму лейтэнанту Наталлі Каліноўскай, намесніку камандзіра 317-га асобнага гвардзейскага мабільнага батальёна 103-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады Узброеных Сілаў капітану Дзмітрыю Мальцаву, а таксама камандзіру групы спецыяльнага прызначэння воінскай часці 97020 Узброеных Сілаў старшаму лейтэнанту Валерыю Маркевічу.

Падзякі за шматгадовую плённую працу ў галіне судова-медыцынскай экспертызы і ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў удастоены начальнік упраўлення па Магілёўскай вобласці Дзяржаўнай службы медыцынскіх судовых экспертыз Мікалай Кулінчык.

Адзначаны значны асабісты ўклад у паслядыпломную бесперапынную адукацыю кіраўнікоў і спецыялістаў сельскагаспадарчых арганізацый і падрыхтоўку рэзерву кіруючых кадраў прафесара кафедры аграбізнэсу Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Эдуарда Пятровіча.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Прадстаўнікі праваахоўных органаў і Узброеных Сілаў Беларусі ўдастоены дзяржузнагародаў

**Дзяржаўных узнагародаў за шматгадовую плённую працу, значныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, узорнае выкананне службовых абавязкаў, заслугі ў забеспячэнні падтрымання законнасці і ўмацавання правапарадку, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выратаванні людзей, удастоены 28 грамадзян краіны. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 21 мая.**

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны намеснік начальніка крымінальнай міліцыі па аператыўна-вышуковай рабоце галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама палкоўнік міліцыі Генадзь Захараў.

Ордэна «За асабістую мужнасць» удастоены міліцыянер-кінолаг 6-й роты палка патрульна-паставой службы міліцыі ГУУС Мінгарвыканкама прапаршчык міліцыі Аляксей Гаручка і прапаршчык міліцыі ў запасе Леанід Матыліцкі, ордэна Пашаны — старшыня Гомельскага абласнога суда Людміла Міхалькова, генеральны дырэктар ААТ «Гомельбудматэрыялы» Алег Сейбель.

Медалём «За адвагу» ўзнагароджаны старшы тэхнік мотастралковай роты 40-га асобнага гвардзейскага механізаванага батальёна 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады Заходняга аператыўнага камандавання Сухапутных войскаў Узброеных Сілаў старшы прапаршчык Аляксандр Басак і камандзір кадра роты кадра асобнага механізаванага батальёна той жа брыгады капітан Віталь Трубчык.

Акрамя таго, шэрагу грамадзян прысуджаны медалі «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За працоўныя заслугі», а таксама медалі Францыска Скарыны.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Аляксандр Лукашэнка адобрыў заключэнне пагаднення з Расіяй аб адзнаках аб шлюбе ў пашпартах

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў заключэнне шляхам абмену нотамі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным унясенні адзнак аб заключэнні або скасаванні шлюбу ў пашпарты грамадзян Беларусі і Расіі. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 21 мая.**

Заключэнне гэтага пагаднення дасць магчымасць кампетэнтным органам дзяржавы аднаго боку, на тэрыторыі якой заключаецца або скасоўваецца шлюб паміж грамадзянамі Беларусі і Расіі, уносіць адпаведныя адзнакі ў пашпарты грамадзян дзяржавы другога боку.

Рэалізацыя гэтага дакумента павінна стварыць для грамадзян дзвюх краін роўныя ўмовы пры рэгістрацыі або скасаванні шлюбу, вызваліўшы іх ад неабходнасці звяртацца ў органы сваёй дзяржавы для ўнясення адзнак у пашпарт.

У адпаведнасці з указам Прэзідэнта, Міністэрству замежных спраў Беларусі даручана ажыццявіць неабходныя працэдуры па заключэнні пагаднення.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# Беларусь будзе нязменна прытрымлівацца традыцый праваслаўнай веры

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 мая павіншаваў Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла з днём тэзаімянінаў.**

«Ваша праца на ніве маральнага адраджэння і асветы, развіцця міжканфесіянальнага дыялога, значны ўклад у справу ўз'яднання з Рускай Праваслаўнай Замежнай Царквой здабылі Вам аўтарытэт і прызнанне ва ўсім свеце», — гаворыцца ў віншаванні.

«Для нас Праваслаўе — духоўная аснова адзінства рускага і беларускага народаў, тая сіла, якая дапамагае пераадольваць межы ў агульным імкненні да ідэалаў брацкай любві, міласэрнасці і дабра. Беларусь будзе нязменна прытрымлівацца традыцый праваслаўнай веры, якая стала неад'емнай часткай яе гістарычнага лёсу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Беларусь прапануе Расіі актывізаваць работу па рэалізацыі сумеснага антыкрызіснага плана

**Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі па выніках сустрэчы са старшынёй урада Расіі Уладзімірам Пуціным у Астане, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Перш за ўсё мы будзем абмяркоўваць рэалізацыю сумеснага антыкрызіснага плана. Мы засяродзілі сваю ўвагу на тых пытаннях, якія хацелі б пасунуць з улікам таго, што ў антыкрызісным плане былі распісаны канкрэтныя сістэмы мераў па допуску беларускай прадукцыі на роўных умовах на расійскі рынак і расійскіх тавараў на беларускі рынак. Пакуль што, на жаль, гэта тэма не спрацоўвае», — сказаў Сяргей Сідорскі. Банкаўская сістэма атрымала адпаведныя рэсурсы, але яны не працуюць на эканоміку, а застаюцца ў банках. «Таму мы са старшынёй урада Расіі засяродзілі ўвагу на тым, каб знайсці варыянты, як надаць імпульс развіццю эканомік, аднавіць той тавараабарот, які быў з Расійскай Федэрацыяй раней, бо за першы квартал 2009 года ён скараціўся амаль на 50 працэнтаў».

# ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

**Дэлегацыя Амана сустрэлася з кіраўніцтвам абедзвюх палат парламента. У графіку шасцідзённага візіту дэлегацыі Дзяржаўнага савета Султаната Аман — наведванне БелАЗа, Амкадора, агракамбіната «Ждановічы», Ваеннай Акадэміі і Нацыянальнай бібліятэкі.**

Старшыня Савета Рэспублікі Барыс Батура спадзяецца, што візіт паслужыць новым штуршком у адносінах паміж заканадаўцамі Амана і Беларусі. Ён прызнаў, што кантакты пакуль нельга назваць інтэнсіўнымі, аднак работа над іх паляпшэннем вядзецца. У прыватнасці, палітык зрабіў акцэнт на сферах турызму, культуры, адукацыі, інвестыцыйнай дзейнасці.

Кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка выказаў спадзяванне, што візіт будзе плённым, пройдзе на аснове ўзаемнага даверу. Старшыня Дзяржаўнага Савета Султаната Аман Ях'я бен Махфуд аль-Мандтэры назваў галоўнай мэтай візіту — умацаванне адносінаў паміж дзвюма краінамі. Ён падкрэсліў вялікую ролю парламентаў у гэтым. «Аб'ём таваразвароту вельмі сціплы (11 млн долараў), — адзначыў госць, — аднак гэта толькі пачатак. Ёсць розныя сферы, дзе мы можам працаваць разам, — гандаль, турызм, энергетыка, інвестыцыі». Кіраўнік дэлегацыі згадаў аб праекце, дзе аманскі бок гатовы ўкладваць інвестыцыі, і выказаў спадзяванне, што ў хуткім часе ён пачне дзейнічаць. Старшыня Дзяржаўнага савета таксама запрасіў кіраўніцтва беларускага парламента наведаць Аман.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# ТАВАРААБАРОТ БЕЛАРУСІ І ААЭ ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ УЗРОЎНЮ ВЫШЭЙШАГА ПАЛІТЫЧНАГА ДЫЯЛОГА ПАМІЖ ДЗЯРЖАВАМІ

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з міністрам замежных спраў ААЭ шэйхам Абдалой бен Заідам аль-Нахаянам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

У 2008 годзе агульны аб'ём знешнегандлёвага тавараабароту Беларусі склаў $72 млрд, пры гэтым з ААЭ ён склаўся на ўзроўні крыху больш як $20 млн.

# ПАЛЁТ ДА ЗОРАК

Паэты не паміраюць. У нейкі момант іх праводзяць — нібыта ў палёт да далёкіх зорак, — дзе час ідзе па-іншаму, і яны проста не паспеюць вярнуцца дадому пры нашым жыцці. Але зямны час дае магчымасць трымаць сувязь з іх душамі — праз любоў, якая засталася пасля іх. Максім Багдановіч на зямлі пакінуў шмат любові — у тых вершах, якія ўжо жывуць па-за часам. Ён пакінуў шмат цяпла любові, а сам пры гэтым згарэў так рана. Але хто скажа, што мала паспеў? Слава Багдановіча і словы Багдановіча нарадзілася тады, калі ён, які вырас у Расіі, адчуў сябе сынам зямлі сваіх продкаў, калі ён зразумеў, што павінен пісаць па-беларуску. Учора, у дзень яго смерці, словы паэта зноў гучалі з вуснаў тых, хто яго любіць, на мітынгу памяці паэта. 92 гады прайшло. А зорка Багдановіча ззяе з нябеснай вышыні.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Мікалай ФЯСЬКОЎ:

Дата

# «БЫЛО ВІДАВОЧНА, ШТО КРАІНА ПАЙШЛА ЎЖО ПА ІНШЫМ ШЛЯХУ, НЕ ПА ТЫМ, ПА ЯКІ РУХАЛАСЯ ДАГЭТУЛЬ»



**25 мая 1989 года я закончыў сярэднюю школу, у гэты дзень у нас быў «апошні званок». Дагэтуль памятаю асабістыя пачуцці — і радасныя, і крыху трывожныя — ад таго, што скончыўся адзін этап жыцця, а наперадзе быў зусім іншы, невядомы, дарослы. Марылася, верылася, што ўсё будзе добра. Квітнеючы май толькі падкрэсліваў, узмацняў адметнасць моманту, надаваў упэўненасці, што ўсё запланаванае — спраўдзіцца. І, можна сказаць, сапраўды менавіта ў гэты дзень вырашаліся лёсы маіх равеснікаў. Мы не ведалі пра тое, не задумваліся, мы проста радаваліся самому жыццю, а насамрэч «падмурак» далейшых нашых спадзяванняў і памкненняў закладваўся ў гэты ж дзень у Маскве, дзе пачаўся І з'езд народных дэпутатаў СССР. Даволі хутка на слыху сталі пастаяннымі прозвішчы невядомых дагэтуль людзей, з'явілася нейкае невядомае, хутчэй, інтуітыўнае прадчуванне (на падставе размоў і паводзінаў дарослых), што нешта ўжо змянілася і будзе змяняцца надалей...**

Мікалая Фяськова цяперашнія абітурыенты і іх бацькі ведаюць найперш як дырэктара Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Між тым Мікалай Сцяпанавіч выбіраўся дэпутатам мясцовых органаў улады, народным дэпутатам СССР, членам Вярхоўнага Савета СССР, намеснікам Старшыні камісіі Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР. Натуральна, вельмі добра памятае і сам той першы з'езд, і тое, што яму папярэднічала. І ўвогуле — атмасферу таго, без перабольшвання, гістарычнага моманту. Мы папрасілі Мікалая Фяськова прыгадаць падзеі 20-гадовай даўніны. Што найбольш запомнілася асабіста яму? Ці ёсць у яго якія шкадаванні адносна таго, што, магчыма, нешта не атрымалася ажыццявіць тады? Ці, наадварот, ёсць усе падставы ганарыцца канкрэтнай справай?..

— Заўважнымі, значнымі былі ўсе падзеі ў той час — пачынаючы з самай падрыхтоўкі да выбараў, якія праходзілі на працягу больш за тры месяцы. Я быў кандыдатам ад 558-й Мазырскай акругі, у якую ўваходзіла палова Палесся. І мы калясілі па ёй — кожны са сваёй праграмай — з маім апанентам, дырэктарам нафтаперапрацоўчага завода. Вось вам першы прыклад адметнасці таго часу, пра які мы гаворым: альтэрнатыўныя выбары, калі быў не адзін кандыдат, а некалькі. Гэта было неверагодна. Гаворачы сучаснай мовай, мой апанент быў эканамічным менеджарам, фігурай у краіне даволі вядомай і ўплывовай. Я ж на той момант быў звычайным дырэктарам сярэдняй школы. І людзі гэта бачылі, разумелі, што ідуць сапраўды дэмакратычныя выбары. Вядома ж, памятаюцца адчуванні ад усведамлення таго, што ты ўдзельнічаеш у палітычнай барацьбе. Былі і сумненні, аднак літаральна ў апошнія дні я адчуў, што супернік здае. Сам жа па рэакцыі выбаршчыкаў бачыў, што мае словы знаходзяць у іх падтрымку. Хоць і на некалькі працэнтаў, але ў выніку сабраў больш галасоў, — сказаў Мікалай Сцяпанавіч.

— Першы з'езд пакінуў вялікія ўражанні. Упершыню з трыбуны ўголас гаварылі тое, што дагэтуль сказаць не маглі, або выказвалі толькі шэптам. Безумоўна, былі розныя выступленні... Я ведаю, што трансляцыі з залы пасяджэнняў людзі глядзелі літаральна як спектакль. Кажу гэта без аніякай іроніі, другога сэнсу, проста гэта зноў жа было ўсё ўпершыню, было нязвыклым. Памятаю і першае публічнае выступленне Сахарава, якога называлі антысаветчыкам. Памятаю і, на жаль, шматлікіх папулістаў, якія палымяна «змагаліся» з засіллем партыйнай наменклатуры. Асноўная праца вялася падчас пасяджэнняў камісій, на сесіях Вярхоўнага Савета ўжо прымаліся адпаведныя рашэнні. Між тым асобныя нашы калегі публічным выступленнем на сесіі імкнуліся толькі прыцягнуць да сябе ўвагу. Уплыў кампартыі быў ужо не тым, яны не адыгрывалі першых роляў, аднак за ўладу яшчэ трымаліся моцна.

...Ці ёсць шкадаванні... Напэўна, з-за таго, што не змаглі скіраваць цалкам краіну на той шлях, па якім цяпер ідзе той жа Кітай. Магчыма, далейшыя падзеі праходзілі б без тых стратаў... Не атрымалася, не хапіла вопыту. Але, з іншага боку, і гэта, бясспрэчна, можна аднесці да станоўчых вынікаў у прыватнасці і таго ж першага з'езда народных дэпутатаў СССР, стала відавочным, што краіна крочыць ужо па іншым шляху, не па тым, па якім рухалася доўгія дзесяцігоддзі дагэтуль...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даслоўна

## Князь Мацей РАДЗІВІЛ:

# «У МІНСКУ Ў МЯНЕ НЯМА СУМНЕВУ, ШТО Я Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ»



**У канцы першага дня візіту князь Мацей Радзівіл ад імя ўсіх гасцей падсумаваў для карэспандэнта «Звязды» першыя ўражанні ад Беларусі.**

— Першы раз я быў у Мінску 20 гадоў таму. Мне падаецца, што горад вельмі змяніўся. Ёсць шмат новых крамаў, гатэляў, рэстаранаў. Я памятаю яшчэ, як Траецкае прадмесце стаяла ў руінах. Мне вельмі падабаецца, што некаторыя гістарычныя будынкі ў Мінску добра адбудаваныя. Мы былі ў двух касцёлах. Мне спадабалася, што там было шмат людзей, у тым ліку маладых. Я бачу, што людзі цікавяцца рэлігіяй, традыцыяй — гэта вельмі важна. Бо мы, Радзівілы, адсюль. Мы — грамадзяне Вялікага Княства Літоўскага, я так кажу заўсёды.

***— Атрымліваецца, што вы гэтак палякі, як і беларусы?***

— Так! ВКЛ было ўнікальнай дзяржавай, якая аб'ядноўвала шмат нацыянальнасцяў і рэлігій. На жаль, сёння такая дзяржава немагчымая. Але 350 гадоў таму гэта быў узор для іншых дзяржаваў. Там была талерацыя, там не было шмат падаткаў, гэтая краіна не атакавала іншыя. Наша сям'я жыла ў Вялікім Княстве — значыцца, у Беларусі, Польшчы, Літве, ва Украіне. Я ведаю, што цяпер некаторыя кажуць, што Літва — гэта сэрца Вялікага Княства Літоўскага. Але я думаю, што Беларусь — гэта сэрца Вялікага Княства! Але гэтая дыскусія, магчыма, не мае сэнсу, бо сэрца Вялікага Княства б'е ў кожнага тут (паказвае на грудзі)...

***— Як вы лічыце, сёння Мінск з'яўляецца еўрапейскім горадам, а Беларусь — часткай еўрапейскай супольнасці?***

— Так! Безумоўна, гэта еўрапейскі горад. Ён іншы, чым Варшава і Лондан. Але тут у мяне няма сумневу, што мы ў Еўропе, у сэрцы Еўропы.

***— Якая асноўная мэта вашага візіту?***

— Мы прыехалі сюды з нашай цёцяй Эльжбетай Радзівіл. Перад вайной яна жыла са сваім бацькам, ардынатам Альбрэхтам Радзівілам, у Нясвіжы. Магчыма, гэта апошняя магчымасць прыехаць сюды з ёй, пабачыць Нясвіжскі замак, Фарны касцёл, крыпту. Яна — апошняя асоба, якая памятае, які быў Нясвіжскі замак перад вайной.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.**

# 29-гадовая жанчына загінула ў выніку ДТЗ

Здарэнне

**ДТЗ адбылося каля 8.15 гадзін у панядзелак. Жанчына пераходзіла праспект Незалежнасці ў нявызначаным месцы і была збіта легкавым аўтамабілем. Урачы хуткай дапамогі канстатавалі смерць.**

Здарэнне адбылося ў час пік, калі рух па праспекце найбольшы. Машыны ў такі час ідуць шчыльнай плынню. Жанчына пераходзіла дарогу за 20 метраў ад падземнага пераходу ад філармоніі на плошчу Я. Коласа. Яна амаль дайшла да канца дарогі, калі яе збіў легкавы аўтамабіль. У выніку атрымала цяжкія траўмы галавы, не сумяшчальныя з жыццём. Смерць наступіла на месцы.

— У такой плыні кожны вадзіцель стараецца сачыць за сітуацыяй перш за ўсё перад сабой. Мала хто разлічвае, што тут могуць хадзіць пешаходы: у гэтым месцы пераход праезнай часткі забаронены. Тым больш што недалёка ёсць падземны пераход, — кажа Мікалай Валуеў, старшы следчы па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення папярэдніх расследаванняў ГУУС Мінгарвыканкама. — Аднак адназначна сказаць, вінаваты вадзіцель ці не, мы не можам. Усе акалічнасці будуць высвятляцца. Разбор зойме не менш чым два месяцы.

Сёлета за чатыры месяцы ў сталіцы адбылося 351 ДТЗ, у выніку якіх 11 чалавек загінула, 405 былі параненыя. Па віне пешаходаў адбылося 62 здарэнні: 4 чалавекі загінулі і 60 атрымалі раненні. Асноўныя парушэнні — пераход дарогі ў нявызначаным месцы, пераход на чырвонае святло, выхад з-за стаячага транспартнага сродку.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## Абзац

◢ Беларуская чыгунка правядзе конкурс на лепшую назву для новага фірмовага цягніка Мінск—Кіеў, які плануецца запусціць сёлета восенню. Акцыя «Дай імя цягніку», як мяркуецца, пачнецца на наступным тыдні.

◢ **У Мінску расце колькасць кінутых гаспадарамі транспартных сродкаў, якія загрувашчваюць горад. Мінчане актыўна купляюць новыя аўто, пакідаючы старыя «Жыгулі», «Масквічы» і нават іншамаркі на стаянках і абочынах праезнай часткі. У год у сталіцы прыбіраецца 1,5 тыс. машын. Толькі за апошнія 3 гады на звалцы апынуліся 4,5 тыс. такіх «бабулек».**

◢ Пры будаўніцтве дома ў Мінску загінуў рабочы. Няшчасны выпадак адбыўся па вуліцы Камсамольскай. 22-гадовы рабочы аднаго з прадпрыемстваў па неасцярожнасці зваліўся з 7-га паверха дома, які будуецца. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў ён памёр. Пракуратура праводзіць праверку.

◢ **Двое маладых людзей, хлопец і дзяўчына, загінулі ў выніку абвалу сцяны, як мяркуецца, зямлянкі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Надзвычайнае здарэнне адбылося ў цэнтры Валгаграда. Трое маладых людзей выявілі ход у скляпенне і паспрабавалі прайсці па ім. Аднак адбыўся абвал, у выніку ўсе трое апынуліся заваленымі. Аднаму ўдалося выбрацца, ён выклікаў выратавальнікаў, якія дасталі з-пад завалаў целы загінулых, 15 і 17 гадоў.**

◢ Па меншай меры 11 чалавек загінулі ў выніку даўкі ў мараканскай сталіцы Рабат пасля музычнага фестывалю. Каля 40 чалавек атрымалі раненні. Інцыдэнт адбыўся на стадыёне на канцэрце папулярнага мараканскага спевака. На канцэрт прыйшло каля 70 тыс. гледачоў.

◢ **На поўначы Масквы ўчынена забойства ў адным з дзіцячых садкоў. У нядзелю раніцай персанал садка знайшоў у падвале цела дворніка. Як выявілі работнікі праваахоўных органаў, смерць наступіла ў выніку чэрапна-мазгавой траўмы, нанесенай рыдлёўкай. Следчыя высвятляюць усе акалічнасці.**

## Поўны абзац

◢ У кітайскай правінцыі Хэбэй жыве дзяўчынка, якая ў свае год і 9 месяцаў умее распазнаваць больш за 2 тыс. іерогліфаў. Такой колькасцю знакаў школьнікі авалодваюць у пятым класе. З дзяўчынкай займаецца мама. У кітайскай мове налічваецца больш за 8 тыс. іерогліфаў. Той, хто ведае паўтары тысячы, лічыцца адукаваным.

◢ **Тысячы пчолаў атакавалі краму камп'ютарных гульняў у Нью-Ёрку. Супрацоўнікі крамы апынуліся на некалькі гадзін заблакаванымі ўнутры памяшкання. На дзвярах павесілі аб'яву «Часова зачынена ў сувязі з нашэсцем пчолаў». Тэрыторыя каля крамы была ачэпленая паліцыяй. Справіцца з насякомымі дапамог выпадковы мінак, які, не надзяваючы маскі і пальчатак, сабраў тысячы пчолаў у каробку, якую потым загарнуў у вялікі мех для смецця. Затым за справу ўзяліся спецыялісты.**

◢ Кіраўніцтва чэшскай бальніцы, якая адчувала недахоп персаналу, прыняла рашэнне заахвочваць супрацоўніц бясплатнымі аперацыямі па павелічэнні грудзей, падцяжцы жывата і выдаленні тлушчу. Тыя, хто заключыў з бальніцай трохгадовы кантракт, мае магчымасць бясплатна прайсці адну з гэтых працэдур. Ініцыятыва кіраўніцтва аказалася эфектыўнай. Штат медустановы запоўнены, дзясяткам прэтэндэнтак давялося адмовіць. Аперацыя па павелічэнні грудзей каштуе ў бальніцы каля 3 тыс. еўра, што амаль утрая перавышае месячны заробак медсястры. Большасць медсёстраў з'язджаюць з Чэхіі ў заходнія краіны Еўропы ў пошуках лепшых заробкаў.



***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Спорт-тайм

# БАТЭ НЕ ДАГОНЯЦЬ?

У дзявятым туры чэмпіянату краіны па футболе чэмпіён краіны барысаўскі БАТЭ ўзяў рэванш у «Нафтана» за паражэнне ў паўфінале кубка краіны. Барысаўчане разграмілі суперніка ў Наваполацку з лікам 4:0 (Радзькоў, 13, Скавыш, 26, Крывец, 72, Паўлаў, 75). Пры гэтым Сяргей Крывец на 77-й хвіліне не рэалізаваў пенальці. З другога месца на трэцяе апусціўся віцэ-чэмпіён мінскае «Дынама», які ўнічыю 1:1 згуляў у Салігорску з мясцовым «Шахцёрам». Астатнія вынікі: «Граніт» (Мікашэвічы) — «Нёман» (Гродна) — 1:1, «Гомель» — «Днепр» (Магілёў) — 2:0 , «Віцебск» — «Дынама» (Брэст) — 0:2, МТЗ-РІПА (Мінск) — «Смаргонь» — 2:1,

«Тарпеда» (Жодзіна) — «Мінск» — 1:0. Становішча камандаў: БАТЭ — 25 ачкоў, «Дынама» (Бр) — 17 (11-7), «Дынама» (Мн) — 15, «Тарпеда» — 15, МТЗ-РІПА — 14, «Нёман» — 14, «Нафтан» — 13, «Днепр» — 13, «Гомель» — 12, «Мінск» — 9, «Граніт» — 8, «Шахцёр» — 8, «Віцебск» — 7, «Смаргонь» — 5. Дзясяты тур пройдзе 27 і 30 мая.

# З ПОЗНАНІ З 6 МЕДАЛЯМІ

Беларускія байдарачнікі і канаісты выйгралі 6 медалёў на этапе Кубка свету, які прайшоў у польскай Познані. Залатыя ўзнагароды заваявалі Раман Петрушэнка і Вадзім Махнеў у байдарцы-двойцы на дыстанцыі 500 м, браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы ў каноэ-двойцы на 1000 м, а таксама экіпаж каноэ-чацвёркі ў складзе Дзмітрыя Рабчанкі, Дзмітрыя Вайцішкіна, Антона Аўрамава і Аляксандра Валчэцкага на дыстанцыі 1000 м. Сярэбранымі прызёрамі сталі экіпажы байдаркі-двойкі на 500 м і каноэ-чацвёркі на 1000 м. Бронза на рахунку залатой алімпійскай байдаркі-чацвёркі Пекіна ў складзе Рамана Петрушэнкі, Артура Літвінчука, Аляксея Абалмасава і Вадзіма Махнева на дыстанцыі 1000 метраў.

# ТРОЙЧЫ ДРУГАЯ



Беларуская штурхальніца ядра Наталля Міхневіч выйграла яшчэ два сярэбраныя медалі на міжнародных турнірах серыі Гран-пры Паўднёвай Амерыкі ў Бразіліі. З вынікам 20 м 3 см яна стала другой ва Уберландзіі, а ў Белеме для «серабра» ёй хапіла 19 м 89 см. Нагадаем, на першым этапе Гран-пры Паўднёвай Амерыкі, які праходзіў у Рыо-дэ-Жанейра, Наталля накіравала снарад на 19 м 48 см і таксама стала другой. У сусветным рэйтынгу Наталля паднялася на пятае месца. Узначальвае рэйтынг новазеландка Валеры Вілі. Адзначым таксама, што на міжнародных спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы ў нямецкім Гале ў кіданні молата Юрый Шаюноў выйграў «серабро».

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ Ў РАСІІ ДАРАЖЭЮЦЬ У 10 РАЗОЎ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ У ЕС

**Рост цэнаў на прадукты харчавання ў РФ у студзені—красавіку 2009 года склаў 5,8 %, што ў 10 разоў перавысіла падаражанне харчовых тавараў у ЕС (0,6 %), сведчаць звесткі Расстата.**

Нягледзячы на шматлікія паведамленні аб рэзкім запаволенні інфляцыі ў красавіку-маі гэтага года, прадукты харчавання ў Расіі ў красавіку сталі даражэйшымі на 0,5 %, у той час як у краінах ЕС у сярэднім яны патаннелі на 0,1 %.

## ЕЎРАПЕЙСКІЯ ФЕРМЕРЫ ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРАЦЬ ТАННАГА МАЛАКА

**У панядзелак 12 тысяч французскіх фермераў заблакавалі пад'езды да 81 малочнага завода краіны ў знак пратэсту супраць нізкіх закупачных цэнаў на малако.**

Адначасова фермеры з дзесяці краін Еўрасаюза праводзяць дэманстрацыю пратэсту ў Брусэлі. Фермеры сцвярджаюць, што нягледзячы на 30-працэнтнае падзенне закупачных цэнаў на малако ў аптавікоў, кошт гатовых малочных тавараў у супермаркетах не змяніўся. Цяпер за літр малака фермеры Францыі атрымліваюць 21 еўрацэнт (каля 780 беларускіх рублёў). Канчатковаму спажыўцу літр малака дастаецца за адзін еўра (каля 3900 беларускіх рублёў).



Французскі ўрад прызначыў пасярэднікаў для перамоў паміж закупшчыкамі і вытворцамі малака, аднак прафсаюзы абяцаюць працягнуць пратэсты па ўсёй Еўропе. Разам з французамі да пратэстаў гатовыя далучыцца нямецкія фермеры, паведамляе Deutsche Welle. Па звестках выдання, у страйку фермераў возьмуць удзел каля шасці з 30 тысяч нямецкіх малочных фермераў.

## ЗША ПАСТАВЯЦЬ ПОЛЬШЧЫ РАКЕТНЫЯ КОМПЛЕКСЫ БЕЗ БОЕГАЛОВАК?



**Зенітныя ракетныя комплексы Patriot, якія ЗША плануюць размясціць на тэрыторыі Польшчы па просьбе кіраўніцтва гэтай краіны, будуць пастаўляцца «толькі для вучэбных і трэніравальных мэтаў» без боегаловак, піша «Время новостей».**

Апошнія будуць складаваныя асобна на тэрыторыі трэціх краін або, магчыма, ЗША. Пазіцыя Пентагона па гэтым пытанні выклікае незадаволенасць польскіх ваенных, бо, паводле іх меркавання, без боегаловак комплексы будуць бескарысныя.

Нагадаем, што планы Польшчы і ЗША выклікаюць незадаволенасць Расіі, якая расцэньвае размяшчэнне амерыканскага кантынгенту з комплексамі Patriot як пагрозу сваёй бяспецы.

## ЭСТОНІЯ З-ЗА КРЫЗІСУ ПРАДАСЦЬ КВАТЭРУ ПАСЛА Ў ЛОНДАНЕ

**МЗС Эстоніі ў сувязі з эканамічным крызісам прадасць вялікую кватэру эстонскага пасла ў Лондане, паведамляе DELFI.**

Паводле інфармацыі Postimees, кватэра плошчай у 145 квадратных метраў была набытая МЗС у пачатку 1990-х гадоў і з тых часоў выкарыстоўвалася ў якасці рэзідэнцыі для паслоў. Дзеючы пасол Маргус Лайдрэ, як паведамляецца, ёю не карыстаецца. У міністэрстве разлічваюць атрымаць за кватэру больш за 1,2 мільёна долараў. Гэтыя сродкі часткова кампенсуюць скарачэнне бюджэту знешнепалітычнага ведамства, якое было вырашана правесці ў рамках чарговага змяншэння дзяржаўных выдаткаў.

## ЖЫХАРОЎ АШХАБАДА ПРЫМУСЯЦЬ ПРАВЕСЦІ ЛЕТА БЕЗ КАНДЫЦЫЯНЕРАЎ

**Жыхары Ашхабада атрымалі паведамленні пра тое, што ім належыць на працягу некалькіх дзён дэмантаваць прыналежныя ім кандыцыянеры. Пра гэта паведамляе «Хроніка Туркменістана».**

Выданне апублікавала фота такога паведамлення. Тым, хто адмовіцца выканаць гэтае патрабаванне, пагражаюць «адміністрацыйнымі мерамі». У сталіцы ходзяць чуткі, што за гэтым рашэннем стаіць прэзідэнцкая служба бяспекі. Сілавікі, па гэтай версіі, вырашылі прыбраць з вонкавых сцен дамоў кандыцыянеры, асцерагаючыся таго, што ў іх «можна схаваць выбуховую прыладу».

Летам у сталіцы, як адзначае выданне, тэмпература паветра часта паднімаецца вышэй за 45 градусаў, а ў шматкватэрных дамах, пабудаваных з бетонных пліт, паветра можа награвацца да 60 градусаў.

# У РЫБАКА СКРАЛІ СКРЫПКУ?



Невядомыя злачынцы пакінулі пераможцу «Еўрабачання-2009» без улюбёнага інструмента. Па чутках, адбылося гэта непасрэдна пасля прылёту Сашы Рыбака ў Осла. Як паведамляюць інтэрнэт-СМІ, прапажы скрыпкі шчаслівы выканаўца мог бы і не заўважыць адразу, калі б не прыхільнікі, якія папрасілі яго выканаць наўпрост у залі чакання хіт «Fairytale». Тут і высветлілася, што сярод багажу футляра з інструментам няма. Меркаванне, што скрыпка магла памылкова трапіць на іншы авіярэйс, пасля праверкі супрацоўнікамі аэрапорта не пацвердзілася.

Пошукамі скрыпкі — а яе кошт пасля фенаменальнай перамогі 23-гадовага артыста на «Еўрабачанні» перавысіў 100 тысяч долараў — цяпер шчыльна займаюцца праваахоўныя органы. Сашу Рыбаку давялося заказваць у адной з нарвежскіх майстэрняў новы інструмент. А зладзеі ў любым выпадку пралічыліся — хоць частку музычнай «Казкі» яны і скралі, але галоўны складнік перамогі — неверагоднае абаянне маладога артыста — немагчыма ні выкрасці, ні купіць, ні перапрадаць...

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Новашино Петришковского сельсовета Минского района, в том числе: **Лот 1** – земельный участок площадью 0,1527 га, начальная цена – 15 000 000 рублей; **Лот 2** – земельный участок площадью 0,1546 га, начальная цена – 15 187 000 рублей; **Лот 3** – земельный участок площадью 0,2016 га, начальная цена – 19 803 000 рублей; **Лот 4** – земельный участок площадью 0,1635 га, начальная цена – 16 060 000 рублей; **Лот 5** – земельный участок площадью 0,1622 га, начальная цена – 15 933 000 рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.03.2009 г. Аукцион состоится **18.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.06.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже двухкомнатной квартиры № 127, расположенной по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв. м, жилая площадь – 26,8 кв. м).**

Начальная цена 172 637 480 белорусских рублей.

**К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 17 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Аукцион состоится **16 июня 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **15 июня 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефон для справок: (017)227 48 36.**

# СТОП, «КАМУНАЛКА»?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У такіх варунках, лічыць Уладзімір Сямашка, найбліжэйшым часам спатрэбяцца дыверсіфікацыя рынкаў і дадатковыя меры па падтрымцы беларускіх прадпрыемстваў. У гэтым выпадку Урад прапануе зменшыць у найбліжэйшы час падатковы цяжар на суб'екты гаспадарання на 1,3 % ад ВУП. У прыватнасці, ёсць намер адмовіцца ад абаротнага «сельскагаспадарчага» падатку, ад збору з продажу, скараціць мясцовыя зборы і падатак на прыбытак. Аднак, каб кампенсаваць страты бюджэту, **прапануецца павялічыць падатак на дабаўленую вартасць — з 18 да 22 %.** У тым ліку, зазначае першы-віцэ-прэм'ер, гэта дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі і «абараніць айчынны рынак ад шырспажыву». Плюс да таго для вырашэння праблемы абаротных сродкаў і захавання інвестыцыйных праграм **Урад выступае з ініцыятывай зніжэння ставак па банкаўскіх крэдытах для прадпрыемстваў амаль удвая — да ўзроўню канца мінулага года.** Пакуль стаўка складае 23-25 % гадавых.

Адсюль, зазначаюць ва Урадзе, з'яўяцца магчымасці для росту зарплаты — **пытанне аб павелічэнні тарыфнай стаўкі І разраду разглядаецца ўжо цяпер.** Тут існуюць розныя варыянты, і ў тым ліку — з чэрвеня. Аднак, хутчэй за ўсё, канчатковае рашэнне будзе прынята пазней — па выніках першага паўгоддзя. Што да аплаты працы, то тут мяркуецца зрабіць і іншыя крокі, прыкладам, павялічыць стымуляванне кіраўнікоў за выкананне прагнозных паказчыкаў вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, а таксама даць наймальнікам магчымасць самастойна прымаць рашэнне аб узмацненні матэрыяльнай зацікаўленасці высокакваліфікаваных работнікаў.

## А як вяртаць крэдыты?

Не сакрэт, што ў многіх краінах ці не найбольш балючы «ўдар» эканамічнага крызісу прыйшоўся на рынак працы. Сітуацыя ў Беларусі з-пад кантролю не выйшла. Колькасць зарэгістраваных беспрацоўных павялічылася амаль на 3 тысячы чалавек, аднак агульны ўзровень беспрацоўя змяніўся нязначна — ён працягвае заставацца ў межах 1 працэнта ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. Пры гэтым за І квартал удалося стварыць 32 тысячы новых працоўных месцаў.

Разам з тым замаруджванне тэмпаў эканамічнага росту пацягнула за сабой зніжэнне эфектыўнасці выкарыстання працоўнай сілы. Значная колькасць прадпрыемстваў працуе ў няпоўным рэжыме — з прадастаўленнем аплаты ў памеры 2/3 ад тарыфнай стаўкі ці ўвогуле водпускаў без аплаты. Як зазначаюць у Федэрацыі прафсаюзаў, **у сакавіку 51 тысяча чалавек знаходзілася ў вымушаных водпусках па ініцыятыве наймальніка, а 65 тысяч — працавалі няпоўны тыдзень.** І перш-наперш гэта датычыцца прамысловасці.

Прычым зразумела: няпоўная занятасць адбіваецца на матэрыяльным стане работнікаў і іх сем'яў. У сувязі з гэтым, лічаць у ФПБ, трэба звярнуць увагу на такую праблему, як дапамога з разлікамі па ранейшых спажывецкіх крэдытах і крэдытах на будаўніцтва жылля. Тым больш што ў гэтым выпадку цяжкасці можна назваць аб'ектыўнымі.

Таксама няпросты момант — дапамогі па беспрацоўі. У прафсаюзах перакананыя, што яны павінны ўзрасці, прычым такой жа думкі прытрымліваюцца і ва Урадзе. Як паведаміў **намеснік міністра эканомікі Алег МЕЛЬНІКАЎ,** пытанне аб павелічэнні выплат беспрацоўным разглядаецца цяпер. Апроч таго, зноў-такі ў якасці «антыкрызіснай меры», распрацаваны варыянт новых правілаў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі.

## Паўтара БПМ. Таму, каму цяжка

Пасля рашэння павысіць «планку даходаў» для прадастаўлення штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамогі да 100 %, а аднаразовай дапамогі — да 120 % бюджэту пражытковага мінімуму, у Беларусі адзначаны рэзкі рост папулярнасці гэтага віду падтрымкі. Нягледзячы на скарачэнне долі малазабяспечанага насельніцтва, летась адрасныя выплаты атрымалі 287 тысяч чалавек, што перавысіла паказчык 2007 года практычна ў пяць разоў. У той жа час змена эканамічнай сітуацыі зноў прыцягнула ўвагу да гэтай праблемы. Таму ўмовы адраснай падтрымкі павінны змяніцца — сёння на гэты конт падрыхтаваны праект спецыяльнага ўказа. Прычым не выключана, што ён пачне дзейнічаць ужо з ліпеня.

Як адзначыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА,** праект вызначае павышэнне «планкі даходу» для атрымання права на аднаразовую адрасную дапамогу са 120 да 150 % бюджэту пражытковага мінімуму, а тэрмін штомесячных выплат плануецца павялічыць з 3 да 6 месяцаў. Пры гэтым ёсць намер прадугледзець ва ўказе магчымасць бясплатнага забеспячэння пратэзна-артапедычнымі вырабамі без уліку даходаў інвалідаў ІІІ групы і дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але па паказаннях медыкаў маюць патрэбу ў сродках тэхнічнай рэабілітацыі. На сёння гэтыя катэгорыі фактычна вымушаныя набываць дапаможныя сродкі за ўласныя грошы, тым часам толькі ў якасці канстатацыі: кошт пратэза можа дасягаць 800—1500 тыс., гарсэта — 750—800 тыс., пары артапедычнага абутку для дзяцей — 250—350 тыс. рублёў.

## Сярэдні — яшчэ не агульны

Паводле звестак прафсаюзаў, у студзені-красавіку сёлета адносна аналагічнага перыяду летась тарыфы на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўзраслі больш чым на 21 працэнт. У выніку кошт пражывання сям'і з трох чалавек у двухпакаёўцы на 48 «квадратаў» склаў 106,1 тыс. рублёў без уліку і 162,8 тыс. рублёў — з улікам ацяплення. Прычым у параўнанні са снежнем апошняя сума павялічылася на 21 тыс. рублёў, або прыкладна на 7,5 долара ў эквіваленце.

Сапраўды, дзякуючы павышэнню даходаў, «вага» гэтага артыкула ў бюджэце той жа сям'і з 3 чалавек, дзе два чалавекі працуюць і атрымліваюць сярэднюю зарплату, нават крыху зменшылася — да 8,5 % выдаткаў з улікам і да 5,5 % выдаткаў без уліку ацяплення. Аднак сама па сабе «камунальная» тэма застаецца вострай ужо з адной прычыны — сярэднюю зарплату маюць далёка не ўсе. Таму, лічыць **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Леанід КОЗІК,** на праблему неабходна звярнуць увагу. **І прыняць рашэнне аб замарожванні жыллёва-камунальных плацяжоў на крызісны час.**

**Сяргей ГРЫБ.**

Антыкрызісная эканоміка

# ЗА СТОЛ ПЕРАМОЎ — З ІНВЕСТАРАМІ

**У Гомелі прайшоў эканамічны форум-2009, які стаў самым маштабным за ўсе апошнія гады. Удзел у ім узялі каля 800 чалавек, прадстаўнікі шэрагу фірмаў і арганізацый з 22 краін.**

У дакладзе, з якім выступіў старшыня аблвыканкама Аляксандр Якабсон, рэльефна вылучалася думка: неабходна супрацьстаяць фінансава-эканамічнаму крызісу ўсім разам, паляпшаць і наладжваць новыя дзелавыя кантакты, умацоўваць і развіваць сувязі, актыўней абменьвацца вопытам міжнароднага супрацоўніцтва. Дэвізам форуму стаў заклік «Ад дружбы — да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва».

Што датычыцца Гомельшчыны, то яна заўсёды была адкрытая для такога партнёрства. Паспяховае супрацоўніцтва з больш як ста краінамі ў папярэднія гады забяспечвала стабільны рост як прамысловай вытворчасці, так і экспарту. Летась выраблена таварнай прадукцыі больш чым на 10,5 мільярда долараў, прадпрыемствы вобласці ўзаемавыгадна гандлявалі з партнёрамі са 104 краін і больш за ўсё з Расіяй, Германіяй, Нідэрландамі, Польшчай, Украінай. Аднак трэба прызнаць, што фінансава-эканамічны крызіс знізіў апошнім часам экспартную актыўнасць шэрагу прадпрыемстваў вобласці.

Таму ў сферы жыццёва важных інтарэсаў сёння — захаванне існуючых рынкаў і мінімізацыя стратаў за кошт асваення новых. Пэўныя зрухі тут маюцца. Так, сёлета прадукцыя гомельскіх вытворцаў упершыню адпраўлена ў Судан, Філіпіны, Кот-д'Івуар, Ірак. Новыя для даўніх партнёраў тавары пастаўлены ў Арменію, Швейцарыю, ЗША, Кітай, Францыю, Венгрыю і г.д.

Па аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал вобласць займае ў рэспубліцы лідзіруючыя пазіцыі. Летась яны павялічыліся на 18 працэнтаў і склалі амаль 2,5 мільярда долараў. Характэрна, што 40 працэнтаў іх — гэта замежныя інвестыцыі, і што бізнэс са сваімі фінансамі і тэхналогіямі прыйшоў на Гомельшчыну з 27 краін.

Цікавым было выступленне прадстаўніка інвестара кампаніі «Heineken» спадара Хенк ван Гельдэрэна, які расказаў, што летась быў падпісаны пратакол аб намерах мадэрнізацыі Рэчыцкага піўзавода і поўнай яго рэканструкцыі, работы па якіх ужо ідуць поўным ходам. Толькі сёлета ў іх будзе ўкладзена 1,3 мільёна еўра, а ў наступным — каля мільёна. Выступоўца падкрэсліў, што клімат на Гомельшчыне, як і ва ўсёй Беларусі, для замежных інвестараў вельмі спрыяльны, бо ўлады максімальна садзейнічаюць у рэалізацыі інвестыцыйных праектаў.

Дарэчы, летась на пятым інвестыцыйным форуме ў Гомелі было падпісана шэсць пратаколаў аб намерах рэалізаваць у рэгіёне інвестыцыйныя праекты на 150 мільёнаў долараў. Нягледзячы на складаную эканамічную сітуацыю ў свеце, усе яны ажыццяўляюцца, акрамя аднаго праекта — па арганізацыі вытворчасці біядызелю з сапрапеллю на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна, які часова прыпынены патэнцыяльным інвестарам з-за адсутнасці суінвестараў.

Нам давялося пагутарыць з прадстаўніком іранскай кампаніі AZARAB панам Салтані, які расказаў, што фірма зацікавілася праектам па распрацоўцы радовішча мелу ў Веткаўскім раёне і будаўніцтвам цэментнага завода. Акрамя вытворчых магутнасцяў плануецца пабудаваць аб'екты сацыяльнай інфраструктуры (дарогі, жыллё і г.д.), што, безумоўна, дасць штуршок развіццю ўсёй тэрыторыі раёна. Папярэдні аб'ём інвестыцый — 250 мільёнаў долараў. У Ветку прыедзе інжынерна-тэхнічны персанал кампаніі, які будзе навучаць мясцовых жыхароў розным спецыяльнасцям. За тое, што Беларусь прадстаўляе фірме свае нетры, 11 працэнтаў акцый цэментнага завода будуць належаць ёй.

На форуме адбылася прэзентацыя трох прыярытэтных інвестыцыйных праектаў: стварэнне транспартна-лагістычнага цэнтра свабоднай эканамічнай зоны «Гомель-Ратон», арганізацыя вытворчасці арміраваных шкловалакном пластыкавых труб і стварэнне музейна-турыстычнага комплексу «Хальч» у Веткаўскім раёне. Затым былі падпісаны пратаколы аб намерах па арганізацыі выпуску пасажырскіх вагонаў з закрытым акцыянерным таварыствам «Крукаўскі вагонабудаўнічы завод» (Украіна), аб супрацоўніцтве па развіцці гасцінічнага бізнэсу з фірмай «AMAKS» (Расійская Федэрацыя) і арганізацыі вытворчасці па атрыманні біягазу з цвёрдых бытавых адходаў (таварыства з абмежаванай адказнасцю «ГАФСА», Украіна).

Я размаўляў з ваяводам Любускага ваяводства (Польшча) Хеленай Хатка і намеснікам дырэктара адной кампаніі з Шанхая Наташай Чао. Першая сказала, што будзе падпісана пагадненне з гомельскім рэгіёнам па супрацоўніцтве ў галіне культуры і адукацыі. Прадстаўніца ж Кітая, якая вучылася ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны, паведаміла, што яна вывучае магчымасці супрацоўніцтва ў галіне будаўніцтва і адкрыцці кітайскага рэстарана ў Гомелі. Пасля я гутарыў з надзвычайнымі і паўнамоцнымі пасламі Украіны, Польшчы і Ізраіля ў Беларусі Валянцінам Вялічкам, Хенрыкам Літвінам і Эдуардам Шапірам, прадстаўніком Бранскага рэгіянальнага аддзялення «Дзелавой Расіі» Ігарам Анохіным, і яны далі высокую ацэнку работы форуму, выказалі ўпэўненасць, што ён прынясе свой плён.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Будоўля моста ў вёсцы Камянецкага раёна праз раку Лясную.

Парламенцкі дзённік

# НЕЗАТУХАЛЬНЫ ІНТАРЭС

## НАРОДНЫЯ АБРАННІКІ ЦЯПЕР КРЫХУ ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

**На нядаўнім выязным семінары з работай выратавальнікаў змаглі пазнаёміцца бліжэй дэпутаты, у нечым таксама выратавальнікі. Ва ўсякім разе людзі гэтак жа маюць патрэбу і ў іх дапамозе, і няхай задачы ў іх не баявыя, але ж часам жыццёвыя калізіі бываюць зусім няпростымі...**



Мы ў Камандна-інжынерным інстытуце. Менавіта тут рыхтуюць выратавальнікаў. Гэта сярэднестатыстычная аўдыторыя нашага інстытута — кажуць гасцям супрацоўнікі. «Відаць, прыхарошваюць», — такая думка ўзнікае пры аглядзе: новенькая мэбля, сучасныя камп'ютары, інтэрактыўная дошка (своеасаблівы велізарны сэнсарны дысплэй, на якім можа быцьададзена любая графічная і тэкставая інфармацыя, у тым ліку і перададзеная з вучэбнага месца), нават свая Нацыянальная бібліятэка! А дакладней — зменшаная ў 100 разоў яе дакладная копія. Гэты будынак відавочна самы складаны ў плане ліквідацыі надзвычайных сітуацый, вось курсантаў і вучаць на ім тактыцы правядзення аварыйна-выратавальных работ.

З кожным новым памяшканнем мы пераконваемся, што ніхто не хітраваў: ёсць і куды больш аснашчаныя аўдыторыі. Напрыклад, гэтая — з імітацыяй умоў на пажары: тут і задымленне, і светлавыя, і шумавыя эфекты. У такіх абставінах за абмежаваны час курсанты разбіраюцца ў змадэляваных на камп'ютары сітуацыях, вырашаюць тактычныя задачы, размяркоўваюць абавязкі, з усёй адказнасцю ставяцца да прынятых рашэнняў — так, нібыта ўсё гэта ў рэальнасці.

Выпрабаванне сапраўднымі надзвычайнымі сітуацыямі курсанты таксама праходзяць — падчас практыкі. Захоўваць цвярозасць розуму і ўпэўнена адчуваць сябе ў сітуацыях, калі звычайныя людзі губляюць галаву, дапамагае грунтоўная ўсебаковая падрыхтоўка. І дэпутаты так актыўна цікавяцца ўсімі яе аспектамі, што арганізатары семінара заўважаюць: «Яшчэ крыху — і вы пачняце праходзіць падрыхтоўку як прафесійныя выратавальнікі».

З'яўляецца ўражанне, што выратавальнікі ведаюць і ўмеюць усё. Узнікае бязмерная павага да іх і... жаданне павучыцца ў Камандна-інжынерным інстытуце. Тым больш што дзяўчат сюды таксама прымаюць — запэўнівае нас **Аляксандр ГЕРАСІМЧЫК, першы намеснік начальніка Камандна-інжынернага інстытута МНС. З 75** бюджэтнікаў на курсе — шасцёра дзяўчат. Конкурс у будучых выратавальніц — 10-12 чалавек на месца, у хлопцаў — удвая меншы. Дзяўчаты займаюцца тым жа, што і хлопцы, апроч баявой работы... Адбор для навучання ў КІІ досыць жорсткі. Паводле слоў Аляксандра Пятровіча, 30-40 працэнтаў ахвотных адсейваецца пасля медыцынскага абследавання. Апроч агульнапрынятага цэнтралізаванага тэсціравання, як і ў звычайных ВНУ, абітурыентам даводзіцца здаваць яшчэ і фізічныя нарматывы — на вынослівасць, хуткасць і сілу. Фізічнай падрыхтоўцы будучых выратавальнікаў у інстытуце, дарэчы, надаюць шмат увагі. Аднак курсанты ўхітраюцца ў дадатак да разумовых і фізічных нагрузак яшчэ і ў КВЗ гуляць, у самадзейнасці вызначацца.

Высачэзны каленчаты пад'ёмнік *(на фота)* — першае, што кідаецца ў вочы, калі мы апынаемся ў Аварыйна-выратавальнай часці №16 Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС. Як тут не кідацца, калі ён дасягае ажно 90 метраў, а спецыяльны рукаў, праз які можна эвакуяваць людзей і з такой вышыні, ярка-аранжавай афарбоўкі. Сустракаючы гасцей, супрацоўнікі жартуюць, маўляў, кожны дэпутат павінен прайсці гэта выпрабаванне. Аднак далей за жарты не ідзе — бяспечны спуск з 90-метровай вышыні дэманструе прафесійны выратавальнік. Хуткасць свайго «падзення» ён рэгулюе, зводзячы і разводзячы рукі, а ніжні край рукава ў гэты час трымаюць двое яго калег. Пад'ёмнік гэты адзіны ў краіне, унікальны, як і будынак Нацыянальнай бібліятэкі, спецыяльна для якога ён быў набыты. Самаму высокаму будынку ў Беларусі — самы высокі пад'ёмнік. Казне ён абышоўся прыблізна ў 1,5 млн еўра.

Дэпутатам паказваюць і іншае абсталяванне падраздзялення, якое спецыялізуецца, дарэчы, на ліквідацыі наступстваў ДТЗ. Неўзабаве апынаемся ў пакоі адпачынку. Адпачываць выратавальнікам даводзіцца ў поўнай амуніцыі — тут ужо не да пераапрананняў, калі па сігнале на спецыяльным табло трэба імгненна мабілізавацца. І слова «імгненна» тут ужытае не фігуральна: каманда выратавальнікаў на адным аўтамабілі павінна выехаць не пазней чым праз 30 секундаў, а калі ў складзе двух і больш аўтамабіляў — 45 секундаў. Работа ў такім рытме цяжкая не толькі фізічна, але і псіхалагічна. Стрэс выратавальнікі здымаюць у зоне рэлаксацыі — у відэазале можна атрымаць асалоду ад прыемнага фільма, а ў зімовым садзе — ад лімоннага паху. Апроч лімонных дрэў тут ёсць і фінікавыя, і нават какававыя. Тут створаны асаблівы мікраклімат, падтрымліваецца пастаянная тэмпература, а фантан не толькі цешыць вока, але і забяспечвае вільготнасць паветра. За тутэйшымі раслінамі, дарэчы, даглядаюць самі байцы. Аднак доўга расслабляцца ў зімовым садзе не даводзіцца — нас ужо чакаюць у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МНС у пасёлку Светлы Гай.

Тут прайшлі павышэнне кваліфікацыі больш як 500 слухачоў з 24 краін блізкага і далёкага замежжа. Па выніках пройдзенай падрыхтоўкі яны атрымліваюць сертыфікат міжнароднага ўзору.

Самае цікавае і відовішчнае чакае нас на Выпрабавальным палігоне Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый МНС. Дэпутаты хоць і назіраюць за вучэннямі з бяспечнай адлегласці — з вышкі — аднак гукі выбухаў і сапраўдныя пажары выклікаюць нежартаўлівы ўсплёск эмоцый. Аднак зладжаныя, адпрацаваныя дзеянні выратавальнікаў унушаюць спакой і ўпэўненасць. Якая б надзвычайная сітуацыя ні мадэлявалася — ці то выбух бытавога газу ў жылым доме, ці буйное дарожна-транспартнае здарэнне, ці то надзвычайная сітуацыя на вадзе — выратавальнікі выходзяць з яе пераможцамі. Верталёт са спецыяльным рэзервуарам забірае ваду і тушыць пажар з вышыні, з рэштай — распраўляюцца на месцы выратавальнікі, якія дэсантаваліся. Каб выцягнуць пацярпелага ў ДТЗ з машыны, яе разбіраюць літаральна па кавалках. Кінолагі адшукваюць людзей пад заваламі. Не застаюцца без работы і вадалазы. Пры дапамозе спецыяльных пнеўматычных падушак можна падняць з вады цэлы аўтамабіль. Убачанае выклікае непадробны інтарэс і адчуванне ўпэўненасці — з такімі ратаўнікамі можна быць спакойнымі за сваю бяспеку...

Праведзены семінар, які выклікаў такі вялікі інтарэс у дэпутатаў, зразумела, меў не толькі пазнавальнае, але і прыкладное значэнне. Ужо на гэтай сесіі народныя абраннікі разгледзяць у другім чытанні праект закона аб органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь. Таму так важна на свае вочы пабачыць работу ў гэтай сферы.

— Падчас выязнога семінара мы яшчэ раз пераканаліся, што Міністэрства па надзвычайных сітуацыях адпавядае ўсім патрабаванням і займае годнае месца ў сістэме нацыянальнай бяспекі Беларусі, — падкрэслівае **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў для гэтай галіны, вядуць перападрыхтоўку, я сказаў бы, — гэта эталон навучальнай установы. З добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай, выдатнымі кадрамі, побытавымі ўмовамі. І невыпадкова, відаць, мы значную частку кадраў рыхтуем для блізкага і далёкага замежжа. Мы бачым сёння, што значна павялічваецца ўплыў чалавека на прыроду, развіваецца навукова-тэхнічны прагрэс. Назіраем, як шмат сёння аварый тэхнагеннага, прыроднага характару, стыхійных бедстваў. У нас створана пэўная заканадаўчая база, падпісаны шэраг пагадненняў з іншымі дзяржавамі, і яны на сёння адпавядаюць патрабаванням часу, аднак трэба ўдасканальвацца. І каб зверыць гадзіннікі — як працуе прынятае заканадаўства, якія трэба ўнесці карэктывы, дапаўненні, змяненні, — мы і правялі семінар, пагутарылі з практыкамі, маем уласнае меркаванне. І вядома ж, ад гэтага закон будзе станавіцца больш якасным, зразумелым. Закон, які будзе працаваць, абараняць нашых грамадзян ад усяго негатыўнага, перш за ўсё ад надзвычайных сітуацый. І галоўную ролю ў гэтым будуць адыгрываць органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях.

У законапраекце прадугледжваецца стварэнне адзінага нумару выратавання — 112. Шматгадовы вопыт службаў «911» у ЗША і Канадзе, а таксама «112» у Заходняй Еўропе вельмі пазітыўны. Адзіны нумар для выкліку экстранных службаў зручны для насельніцтва, дазваляе павысіць аператыўнасць рэагавання на здарэнні і эфектыўнасць узаемадзеяння службаў пры сумеснай рабоце.

Для пераходу на адзіны нумар у краіне ўжо многае зроблена — запэўніў журналістаў **Міністр па надзвычайных сітуацыях Энвер БАРЫЕЎ.** Застаецца толькі тэхнічна і інавацыйна ўдасканальваць усе гэтыя падыходы, і вядома ж, заканадаўча замацаваць тыя пытанні, якія ўжо вырашаныя на арганізацыйным узроўні. Тэрміны пераходу будуць залежаць ад тэхнічных нюансаў.

Сіламі МНС штогод выратоўваецца 5-6 тысяч жыццяў, папярэджваецца знішчэнне звыш 11 тысяч збудаванняў, ліквідуецца ў пачатковай стадыі больш за палову надзвычайных сітуацый. Сапраўды, ёсць упэўненасць, што наша бяспека ў надзейных руках. А з цягам часу гэта сістэма будзе толькі ўдасканальвацца. Сумеснымі намаганнямі выканаўчай і заканадаўчай уладаў.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# АД СТУДЭНТАЎ ЧАКАЛІ... ХУЛІГАНСТВА

Больш за 200 студэнтаў з Беларусі, Латвіі, Польшчы бралі ўдзел у конкурсе-выставе візуальных мастацтваў вышэйшых навучальных устаноў «Арт-сесія». Вось ужо ў 18-ы раз у старажытным Віцебску адбылося гэтае маштабнае свята мастацтваў. Сёлета журы ўзначальваў вядомы мастацтвазнаўца, дырэктар гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» Мікалай Паграноўскі.

Многія члены журы, дарэчы, канстатавалі, што мастакам-пачаткоўцам — удзельнікам мінулай «Арт-сесіі» не хапіла творчага хуліганства і правакацый у добрым сэнсе гэтых слоў. Напэўна, насамрэч маладыя творцы павінны пазбягаць штампаў і не баяцца эксперыментаваць. Менавіта з ліку такіх «хуліганаў» і выйшлі цяпер ужо славутыя на ўвесь свет мастакі. «Арт-стыпендыя» — добры стымул для пераможцаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**27 мая** — загадчык гастраэнтэралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы А.Г. Сасноўскі.

**28 мая** — загадчык жаночай кансультацыі Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы І. А. Рослік.

**29 мая** — загадчык кардыялагічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы С.І. Клячан.

# ДЗЕЦІ І ВЕТЭРАНЫ ВАЙНЫ БУДУЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ — НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ФІНАНСАВЫЯ ЎЗРУШЭННІ

**— Усе заяўкі на санаторна-курортнае аздараўленне, якія паступаюць ад інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, задавальняюцца стапрацэнтна, — кажа Сяргей Бандарэнка, начальнік прадстаўніцтва «Гомельскага абласнога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва». У Гомельскай вобласці права на бясплатнае штогадовае пазачарговае аздараўленне маюць амаль 4800 ветэранаў. Да кожнага з іх у канцы мінулага года прыходзілі спецыялісты і пыталіся: куды ён хоча паехаць налета? Мы абавязкова задавальняем іх просьбы. Сёлета жаданне выказалі каля 200 чалавек.**

Усяго ж сёлета рэгіянальнае прадстаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва плануе атрымаць 102 тысячы пуцёвак на аздараўленне жыхароў вобласці. Гэта, аднак, больш чым палова ад усіх пуцёвак, якія купляе рэспубліканскі цэнтр. Самы вялікі іх аб'ём прызначаны для насельніцтва, пацярпелага ад аварыі на ЧАЭС — 88 %. Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб штогадовым павелічэнні долі ахопу дзяцей, якія жывуць на забруджаных тэрыторыях, для іх крыху павялічваецца колькасць пуцёвак. Калі казаць аб гэтай катэгорыі ў святле фінансавых узрушэнняў, варта канстатаваць: яе не кранулі ніякія скарачэнні бюджэту. Дзеці, як і раней, будуць адпачываць не толькі ў санаторыях Беларусі, але і ў замежных. Гэта і Туапсэ, і Сочы, і Місхор, Юрмала, Друскінінкай.

Сёлета скарочана колькасць пуцёвак па сацыяльным страхаванні. На дарослых выдзяляецца ў сярэднім 2 пуцёўкі на тысячу працуючых. Для дзяцей — 5,5 пуцёўкі, у санаторыі для маці і дзіцяці — таксама 2 пуцёўкі на тысячу працуючых. У 2005 годзе, да рэфармавання галіны, было 28—29 пуцёвак на 1000. А ў 2006-м — пасля рэфармавання — ні адной пуцёўкі. Таму можна казаць, што хоць і вельмі паступова, але пачынае вяртацца гэтая сацыяльная дапамога насельніцтву.

***— Вы цяпер займаецеся і аздараўленнем пенсіянераў — раней яны абслугоўваліся камітэтам па працы і сацыяльнай абароне...***

— Так. Каля 300 тысяч чалавек гэтай катэгорыі сёння жыве на тэрыторыі Гомельшчыны. Безумоўна, не ўсе яны становяцца ў чаргу на пуцёўкі — толькі трэцяя частка. Пуцёвак ім выдзяляецца каля 3100-3200 на ўсіх. Ёсць і такая катэгорыя, як дзеці-інваліды, іх у Гомельскай вобласці 4095. Плануем сёлета аздаравіць каля 140. Справа ў тым, што многія маюць супрацьпаказанні да санаторна-курортнага лячэння. А тым, хто не мае, патрэбна пуцёўка з суправаджэннем дарослых. Праўда, цяпер ім пуцёўкі выдзяляюцца пераважна не ў летні перыяд.

***— Што датычыцца санаторыяў — ці запатрабаваныя іх паслугі сёння?***

— На 1 красавіка запаўняльнасць здраўніц складала 89 %. Два-тры гады таму была ў лепшым выпадку 45 %. Рэфармаванне сістэмы паклала пачатак рабоце здраўніц ва ўмовах рынку. Напрыклад, сёння цяжка купіць пуцёўку ў санаторый «Прыдняпроўскі» — там да канца жніўня ўсе пуцёўкі прададзеныя. Таму, калі хочаш аздаравіцца, аб пуцёўках трэба загадзя клапаціцца. Цяпер пачалі добра працаваць нават тыя санаторыі, на якія мы не ўскладалі вялікіх надзей. Тыя ж «Чонкі». Летась там зарабілі грошы, купілі некалькі ўнікальных апаратаў, на іх сёння запісваюцца загадзя і прыязджаюць з Гомеля. Павялічылася камфортнасць умоў у санаторыях. Сярод кліентаў цяпер не толькі суайчыннікі, але і замежнікі — больш расіяне. Таксама прыязджаюць лячыцца і адпачываць з Прыбалтыкі, Ізраля, Італіі. Калі палякі пабачылі наш цэннік, яны былі здзіўленыя. У іх усе працэдуры разоў у пяць даражэйшыя.

***— Павелічэнне плыні адпачывальнікаў вы звязваеце з паляпшэннем вядзення рэкламнай кампаніі?***

— Яшчэ ў 2007 годзе з'явіўся сайт беларускіх санаторыяў. Большасць маюць свае асабістыя сайты, дзе можна даведацца аб наяўнасці месцаў, іх браніраванні. Пачалі працаваць сучасна, з'явіўся вынік.

***— Многія здраўніцы прапануюць сваю мінеральную ваду...***

— Наша вобласць самая багатая на яе запасы. Калі пасля вайны шукалі нафту, паралельна рабілі заборы вады і яе хімічны аналіз. У нас ёсць унікальная вада, ёсць запасы сапрапелевых гразяў, ёсць вялізнае радонавае возера — на жаль, на забруджанай тэрыторыі. У Лельчыцкім раёне ёсць сапрапелевыя грязі. Каб іх выкарыстоўваць, трэба стварыць мясцовае прадпрыемства, якое б іх здабывала, фасавала і прывозіла ў здраўніцы. Грошы пад нагамі, і для раёна была б добрая крыніца фінансавання. Лельчыцкія раённыя ўлады працуюць над гэтым.

***— Цяпер пачынаецца прыёмка летніх аздараўленчых лагераў.***

— На сёння большасць з іх — 90 % — гатовыя да прыёму дзяцей. Летась было 12, сёлета плануем адкрыць яшчэ адзін. Адназначна: з гэтага году не будзе пагаршацца матэрыяльна-тэхнічная база летніх лагераў. З абласнога бюджэту былі выдзелены істотныя сродкі на падрыхтоўку лагераў — 680 мільёнаў рублёў. Плюс 360 мільёнаў — з рэспубліканскага суботніка. А летась на гэтыя мэты было накіравана толькі 111 мільёнаў рублёў. Атрымліваецца, сёлета ў 10 разоў больш, чым у мінулым годзе. Грошы выкарыстоўваліся для буйных капітальных работ і забеспячэння бяспекі дзяцей. Улічваючы невялікую колькасць месцаў, якія мы маем у нашых лагерах (мы можам аздаравіць 8,5 тысячы дзяцей), выкарыстоўваем таксама арандаваную базу, арганізоўваем лагеры на базе 18 санаторна-курортных устаноў вобласці. Таму ў цэлым за лета мы плануем аздаравіць амаль 12 тысяч дзяцей.

**Гутарыла Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

«Артэрыі» эканомікі

# На якія з іх хопіць грошай?



**На дарожныя работы — утрыманне дарог, бягучы і капітальны рамонт, рэканструкцыю і будаўніцтва — сёлета вылучана 1 272,1 млрд рублёў. Звыш 850 млрд — на рэспубліканскія і каля 420 млрд — на мясцовыя. На што павінна хапіць такіх сродкаў, асабліва калі мець на ўвазе аб'ёмы дарожнай гаспадаркі краіны, а гэта звыш 85 тысяч кіламетраў аўтамабільных дарог агульнага карыстання, больш за 5 тысяч мастоў і пуцеправодаў, 38 дарожных арганізацый? А, па-другое, шэраг праблем, якія назапашваюцца год ад года? Аб сітуацыі на дарогах агульнага карыстання і на тых, што не адносяцца да ліку апошніх, расказвае намеснік дырэктара Дэпартамента «Белаўтадар» Рыгор ШУЛЬГА.**

— Да вышэйшых узроўняў патрабаванняў па ўтрыманні адносіцца 87 працэнтаў рэспубліканскіх і менш за 1 працэнт мясцовых дарог, большасць якіх адпавядаюць 4-му і 5-му ўзроўням. Па рэспубліканскіх «артэрыях» на сёння перасоўваюцца 100 працэнтаў грузавых замежных аўтамабіляў. Дарэчы, адной з найважнейшых тэндэнцый развіцця дарожнай сеткі Беларусі застаецца неабходнасць паскоранага развіцця найбольш грузанапружаных участкаў рэспубліканскіх дарог і будаўніцтва абходаў гарадоў. Актуальным з'яўляецца і абавязковая інтэграцыя беларускіх аўтамагістраляў у Еўрапейскую транспартную сістэму для забеспячэння адэкватнага месца Беларусі ў міжнародных транзітных перавозках. Нельга не ўлічваць і той факт, што аўтадарогі сёння не толькі забяспечваюць пропуск патоку народнагаспадарчых грузаў і перавозку пасажыраў, але і становяцца асяродкам знаходжання для ўладальнікаў транспартных сродкаў, паколькі без дарог ужо немагчымыя як паўнавартасная праца, так і адпачынак мільёнаў грамадзян. У гэтым сэнсе развіццё сеткі аўтамабільных дарог з'яўляецца матэрыяльным увасабленнем свабоды выбару месцажыхарства і працы.

***— Што адбываецца з фінансаваннем дарожнай галіны і як у гэтым сэнсе карэктуюцца яе планы?***

— У апошнія гады з-за пастаяннага зніжэння ўзроўню забяспечанасці фінансавымі рэсурсамі рэзка змяншаюцца аб'ёмы дарожных работ. Калі ў 2008 годзе быў выкананы бягучы рамонт 4 534 км, капрамонт 833 км і пабудавана 175 км дарог, то сёлета бягучы рамонт запланаваны ў дачыненні да 52 працэнтаў ад названай вышэй лічбы, адпаведна капрамонт чакае 18 працэнтаў і будаўніцтва — 51 працэнт дарог. Пры размеркаванні вылучаных сродкаў перавага аддаецца тым відам тэхнічных уздзеянняў, якія дазваляюць з найменшымі затратамі папярэдзіць далейшае разбурэнне дарог. Дарагі капрамонт спланаваны толькі на тых участках, якія знаходзяцца ў перадаварыйным стане.

Да 78 працэнтаў вырасла працягласць аўтадарог, на якіх перавышаны міжрамонтныя тэрміны па капітальным рамонце. Пастаянна расце і нагрузка на дарожныя пакрыцці, што абумоўлена хуткім ростам колькасці транспартных сродкаў у краіне. Паводле прагнозаў, да 2015 года колькасць апошніх дасягне 4 млн. Пастаянна расце і доля цяжкіх буйнагабарытных транспартных сродкаў. За шэсць гадоў колькасць апошніх вырасла амаль удвая. Страты, выкліканыя звышнарматыўным уздзеяннем падчас праезду цяжкіх буйнагабарытных транспартных сродкаў па дарогах летась склалі звыш 100 млрд рублёў. Пры гэтым кампенсацыйная плата за праезд гэтых сродкаў склала ўсяго толькі 11 млрд. Абарона дарог ад звышнарматыўнага ўздзеяння з'яўляецца адной з найважнейшых задач забеспячэння захаванасці дарожнай сеткі.

**Аўтамабільным транспартам перавозіцца звыш 80 працэнтаў грузаў і каля 55 працэнтаў пасажыраў.**

***— Як адчуваюць сябе дарогі агульнага карыстання, да ліку якіх адносяцца тыя, што забяспечваюць транспартнымі сувязямі ўсе населеныя пункты, уключаючы сельскія?***

— З 2003 па 2008 год сетка такіх дарог вырасла з 49 да 86 тысяч км. Разам з тым, фінансаванне дарожнай гаспадаркі засталося на адным узроўні. Цяпер аблвыканкамы ставяць пытанне аб уключэнні ў сетку дарог агульнага карыстання другасных вуліц вёсак, якія, згодна з Законам «Аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці», да такіх не адносяцца. Некаторыя аблвыканкамы прымаюць рашэнне аб перадачы гэтых вуліц на баланс аблдарбудаў. Пры гэтым не вырашаецца пытанне аб фінансаванні работ па ўтрыманні і рамонце гэтых вуліц, а іх налічваецца каля 30 тысяч км.

Хацелася б нагадаць, што з 2007 года функцыі органа дзяржаўнага ўпраўлення па пытаннях будаўніцтва, рэканструкцыі і ўтрымання вуліц у гарадах і сельскіх населеных пунктах ускладзены на Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Міністэрству даручана ў сельскай мясцовасці, у аграгарадках, стварыць вытворчыя падраздзяленні раённых арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі для забеспячэння ўмоў пражывання, якія адпавядаюць сацыяльным стандартам развіцця інжынернай інфраструктуры. Так, Гомельскі аблвыканкам прыняў рашэнне аб перадачы на баланс жыллёва-камунальных арганізацый вуліц і дарог сельскіх населеных пунктаў, якія не адносяцца да дарог агульнага карыстання, але ўтрымліваюцца і рамантуюцца за кошт мясцовых бюджэтаў. Магілёўскі аблвыканкам прыняў рашэнне аб перадачы вуліц, якія не адносяцца да дарог агульнага карыстання, у аграгарадках на баланс жыллёва-камунальных арганізацый раёнаў. Брэсцкаму, Віцебскаму, Гродзенскаму і Мінскаму аблвыканкамам яшчэ неабходна вырашыць пытанне фінансавання ўтрымання і рамонту вуліц вёсак, якія не адносяцца да дарог агульнага выкарыстання. Мы чакаем, што апошнія будуць перададзены, па прыкладзе калег, на баланс і абслугоўванне спецыялізаваных падраздзяленняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Наогул, згодна з Бюджэтным кодэксам, у расходы на дарожную гаспадарку рэспубліканскай і камунальнай формаў уласнасці не павінны ўключацца расходы на ўпарадкаванне аграгарадкоў, вуліц населеных пунктаў, мясцовыя дарогі, праезную частку Мінска, дарогі нацыянальных паркаў...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## НЕ ТОЛЬКІ ГАРЭЛКА ВІНАВАТА

У Ганцавічах быў забіты 26-гадовы жыхар райцэнтра. Яго знайшлі ў кватэры бацькоў.

Вызначана, што забойства адбылося вечарам, калі п'яны бацька напаў на сына і кухонным нажом ударыў яго ў шыю.

А ў г. п. Целяханы натрапілі на забітую жанчыну. Без адзення, з паламанымі рэбрамі і разарванай печанню і лёгкімі яна ляжала ў лесапасадцы.

Пасля сумеснай выпіўкі 38-гадовую жанчыну забілі мясцовыя беспрацоўныя 21 і 22 гадоў.

Узбуджаны крымінальныя справы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# МАЕ СУСЕДЗІ

**Бацькоў, як вядома, не выбіраюць. А вось суседзяў і тэарэтычна і практычна выбраць можна. Хоць зноў жа — для многіх тут, як і з бацькамі, часам усё прадвырашана па месцы і факце нараджэння. І тады ўсё наступнае жыццё побач залежыць як ад цябе самога, так і ад тваіх суседзяў: ці будуць у вас добрыя стасункі, ці зможаш ты разлічваць у цяжкую хвіліну на іх падтрымку або, умоўна кажучы, застанешся ў нейкі момант без дробкі солі. Я лічу, што мне ў жыцці з маімі шматлікімі суседзямі пашчасціла. Гэтыя людзі ўсе розныя, у нас розныя ж стасункі, але ўсіх гэтых не заўсёды знаёмых паміж сабой людзей аб'ядноўвае тое, што яны — добразычлівыя, пераважна руплівыя гаспадары, працаўнікі, майстры, добрыя бацькі.**

### ПАСЁЛАК

...Слаўка заўсёды добразычлівы. Не памятаю нават, калі б хоць аднойчы бачыў яго на людзях нечым моцна раздражнёным. Хоць Слаўка ён для нас — суседзяў, насамрэч яго ўзрост набліжаецца да пяцідзесяці. Але па сваёй адкрытасці, пастаяннай усмешцы і гумару дасць фору і нашмат маладзейшаму. Папросіш у нечым дапамогі — ніколі не адмовіць. Калі якая патрэба ў талаце — газ па вуліцы «цягнуць» або водаправод — ён заўсёды першы арганізатар. Колькі сябе памятаю, заўсёды ў працы: дом, участак. Натуральна, шмат чаго робіць сваімі рукамі. З жонкай Светай выгадаваў двух ужо дарослых дачок. Тыя таксама не цураюцца працы, прынамсі, на агародзе — першыя памочніцы бацькам.

Сяргей працуе на мытні, займае высокую пасаду. Але, як заведзена на вёсцы, практычна ўсё робіць сам па гаспадарцы. Калі што, кліча на дапамогу брата-блізнюка. Прывучае да працы і сына-падлетка.

Саша з Аленай сталі суседзямі маёй маці параўнальна нядаўна. У гаспадара грандыёзныя планы па добраўпарадкаванні дома, шмат чаго ён паспеў ужо зрабіць. А, вядома, каб нешта зрабіць, трэба напачатку зарабіць. Даводзіцца, як кажуць, «круціцца». Вялікі ўчастак таксама патрабуе шмат сілаў, дзе Саша з Аленай завіхаюцца ці не штодня раніцай і ўвечары — перад працай ці пасля яе. Летась трымалі карову, сёлета — свіней. Зноў табе — пастаянны клопат. Сын з дачкой яшчэ не ў тым узросце, каб быць паўнацэннымі памочнікамі, але малеча ўжо пакрысе авалодвае пэўнымі навыкамі. Некалькі тыдняў таму непадалёку здарыўся пажар. Саша ў ліку іншых суседзяў кінуўся на дапамогу, потым казаў, маўляў, што ў тым такога, у ваенным вучылішчы некалі былі трэніроўкі...

Не ведаю, які лёс будзе ў дзяцей суседзяў, але самі яны прызвычаіліся жыць на зямлі, наўрад ці ў іх ёсць жаданне перабірацца ў гарадскія кватэры. Хоць і жыццё такое нельга назваць цалкам вясковым: за апошнія гады шмат чаго змянілася, любыя выгоды кшталту гарадскіх можна мець і ў прыватным доме. Ты гаспадар — калі ў цябе свой дом, участак, жывёла, ёсць дабрабыт, у прамым сэнсе слоў здабыты ўласнымі рукамі. Думаецца, гэта і ёсць галоўнае — не лічачы дзяцей, — што з'яўляецца стрыжнем жыцця суседзяў.

### МАЛАСЯМЕЙКА

Дзесяць гадоў давялося пражыць у здымнай кватэры ў маласямейцы ў Заводскім раёне сталіцы. Большасць насельнікаў таго дома былі гараджанамі ў першым пакаленні — людзямі перадпенсійнага або — па інваліднасці — ужо пенсійнага ўзросту. Хто на цяжкай працы падарваў здароўе, хто ад бу[illegible]. Некалі яны з вёсак з'ехалі на заробкі на заводы, ды так у Мінску і засталіся, аднак каранёў сваіх і сувязі з роднымі мясцінамі цалкам не страцілі. Адсюль было дзіўнае спалучэнне звычак з колішняга і цяперашняга іх жыцця. Падчас сяўбы ці ўборкі ўраджаю ўсе аднолькава хваляваліся пра тэрміны, надвор'е, зрываліся на малую радзіму на дапамогу сваякам, сваім старым бацькам. Потым гэты інтарэс згасаў і ў астатні цёплы час года яны бавілі вольны час на лаўках каля пад'езда — на манер вясковых бабуляў. У бясконцых размовах або нават моўчкі, за гульнёй у даміно ці карты, часам — за выпіўкай. Але з'ехаць жыць дадому нават тыя, хто ўжо быў на пенсіі і марнаваў свой час менавіта такім чынам штодня, не спяшаліся.

Па-вясковаму напачатку насцярожана ўспрымаючы чужака, гатовыя потым — прыняўшы ў «свой дом-вёску» — у любы момант абараніць ад старонніх. Такімі былі нашы суседзі па доме. У іх было прынята вітацца з усімі, з кім едзеш у ліфце. І традыцыйнае прывітанне адной бабулькі — добрага вам здароўечка — гучала цалкам натуральна і шчыра. Суседзі, як мне падалося, вельмі любілі збірацца і ўдзельнічаць у рэдкай талацэ. Памятаю, аднойчы мы сумесна вырашылі паставіць дзверы ў тамбур, павыводзіць званкі... Такія моманты натхнялі суседзяў, пэўна ж, нешта абуджалі ў душы... Людзі шчыра радаваліся магчымасці пагаварыць у іншых абставінах, ахвотна працавалі, перажывалі за агульную справу.

Жылі амаль усе аднолькава не заможна. Але я больш нідзе не бачыў, каб чалавек, што выйшаў у тамбур пакурыць (часам і пасля чаркі), браў з сабой кніжку. І потым так і стаяў з гадзіну, чытаючы і запальваючы чарговую цыгарэту. У новых дамах пасля «еўрарамонту» бібліятэкі выносілі на сметнік...

### НОВАБУДОЎЛЯ

Мае цяперашнія суседзі — па большасці гараджане ў другім пакаленні. Пераважна гэта людзі да 40 ці крыху больш гадоў, практычна ўсе сямейныя, у многіх дзеткі, народжаныя ўжо пасля пераезду бацькоў у новы дом. У большасці захаваліся вясковыя сваякі, да якіх усе ездзяць дапамагаць, але паездкі гэтыя не такія частыя. Пажылых людзей практычна няма.

Стасункі ўвогуле добразычлівыя, аднак вельмі цесных кантактаў, прынамсі, пакуль што асабліва няма. Што цалкам зразумела: адукаваныя людзі, праца, кар'ера, неабходнасць зарабляць грошы на ўтрыманне сям'і, выплату крэдытаў, узятых пад будаўніцтва жылля. Суседзі рана сыходзяць і позна вяртаюцца. Ёсць людзі з рукамі, што, як прынята гаварыць, растуць з патрэбнага месца. Аднак большасць пры правядзенні якіх рамонтных работ наймае спецыялістаў. Спецыфіка гарадскога жыцця і імклівасці бегу часу, якую ўсвядомілі прагматычныя аднагодкі: час — гэта грошы, і — кожны павінен займацца сваёй справай.

Дакладна пастаўленыя жыццёвыя мэты практычна ўсіх суседзяў па доме можна адсачыць па вонкавых прыкметах: пераезд у новую кватэру, якасны рамонт, набыццё машыны. Гэта не для таго, каб перад некім пахваліцца, напэўна, так і павінен жыць любы нармальны чалавек, асабліва калі ён перад гэтым з уласнай сям'ёй паспеў пажыць або на бацькоўскай жылплошчы, або на здымнай. Балазе, як сказаў, у многіх сярод прыярытэтаў — нараджэнне дзяцей. Галоўнае, каб ужо яны потым, атрымліваючы з дзяцінства ўсё гатовае, не сталі прагматычнымі цынікамі.

Была ў нас падобная сітуацыя, калі студэнты-кватаранты адной з кватэр пачалі «разносіць» агульную маёмасць, у якую самі ў сілу маладосці не маглі ўкласці яшчэ ні рубля. Іх дарослыя сваякі, трэба аддаць ім належнае, адрэагавалі на нашу заўвагу належным чынам. Так, з новымі суседзямі заўсёды трэба «прыцірацца», наладжваць стасункі. Той жа студэнт Лёня потым неаднойчы забягаў да нас за штопарам, калі прыходзіла ў госці яго дзяўчына. Суседу Дзіму знізу я аднойчы патэлефанаваў на працу і павіншаваў з набыццём караоке. Адкуль ведаеце, спытаў той? Дык я ж, адказваю, палову ночы не спаў — вам мусіў падпяваць... Андрэй зверху адзін час любіў таксама ўвечары паслухаць музыку на поўную моц. Адно хораша, сказаў я неяк яму, што песні ў вас добрыя — той жа Высоцкі... Канфлікты былі вычарпаны, спадзяюся — назаўсёды. Калі мне трэба пашумець, я заўсёды папярэджваю сваіх суседзяў, загадзя прашу прабачэння за нязручнасці. Мне гэта не цяжка. Затое цяпер я ведаю, калі ў малога суседа Мішкі «ціхая гадзіна», і што маленькая Антаніна можа спакойна спаць практычна пад любыя моцныя гукі.

* * *

У апошні аўторак мая ў многіх краінах Еўропы святкуецца «Дзень суседзяў». Ідэя яго правядзення ўзнікла ў Парыжы ў групы сяброў-аднадумцаў у 1990 годдзе. Яны вырашылі правесці такое свята для сваіх суседзяў па квартале, каб аб'яднаць тых людзей, якія жывуць побач, але, магчыма, часам не ведаюць адно аднаго, не могуць знайсці агульнай мовы, а, значыць, знаходзячыся сярод людзей, фактычна існуюць у адзіноце, ізаляцыі. З таго часу гэта свята падхапілі дзясяткі краінаў, яго адзначалі мільёны людзей. Павіншуйце з ім сёння і вы сваіх суседзяў. І скажыце ім словы вядомага мультыплікацыйнага героя: давайце жыць дружна! Мы патрэбныя адно аднаму.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



*Шаркоўшчынскі раён.*

# КАВАРСТВА ЖАНЧЫНЫ І СЛЕПАТА МУЖЧЫНЫ,

## або Аповед пра тое, як першая на судзе прызналася, што ўпотайкі нарадзіла і загубіла дзіця, а другі (яе муж) даказваў, што гэта — няпраўда

**Гэта незвычайная гісторыя пераходзіла ад аднаго жыхара Навабеліцкага раёна Гомеля да другога даволі працяглы час, і большай часткай яна нагадвала тую анекдатычную сітуацыю, якая завецца «радыёстанцыя АБС», што азначае: адна баба сказала. Ісціна ж выявілася тады, калі ўсе кропкі над «і» расставіў абласны суд. Арыштаваная маладая жанчына, якая ўпотайкі ад свайго мужа нарадзіла дзіця і гэтак жа ўпотайкі ад яго пазбавіла немаўля жыцця і, раскайваючыся ў сваім злачынстве, прызнала ўсё гэта; а яе муж, ніколечкі не сумняваючыся ў сваёй праваце, прынародна заявіў: не верыць ён усяму, сказанаму жонкай. Бо калі б яна была цяжарнай, ён бачыў бы гэта. Яна не нараджала і не забівала хлапчука ў тую ноч. Ён, муж, спаў з ёй тады з вечара да ранку. У адным ложку. І нікуды яна не адлучалася.**

У гэтай гісторыі дзіўна яшчэ і тое, што і свякроў жанчыны прытрымлівалася на судовым пасяджэнні думкі і аргументаў свайго сына, і гэтыя акалічнасці яшчэ больш распальваюць уяўленні і фантазіі не аднаго дзясятка абывацеляў, якія карыстаюцца чуткамі вышэйпамянёнай «радыёстанцыі АБС». Таму лічым неабходным больш падрабязна расказаць аб тым, што і як было на самой справе.

...Марыя Арэшка (прозвішчы і імёны змененыя ў артыкуле па этычных меркаваннях) інтымам пачала займацца ў пятнаццаць гадоў, калі на тройкі вучылася ў школе і пачала захапляцца цыгарэтамі. Бацькі яе, якія нярэдка прыкладваліся да чаркі — а маці дык наогул улягала ў запоі — разышліся, таму асаблівага кантролю над паводзінамі дзяўчынкі не было. Яна перайшла вучыцца ў вячэрнюю школу, бо там, лічыла, ёй будзе лягчэй і вальней.

У 16-гадовым узросце на яе шляху сустрэўся Міхаіл Сазонаў, і «салодкая парачка» закруціла такое каханне, што ў 2007 годзе ў канцы чэрвеня ў яе нарадзіўся сынок. Вяселле і хрэсьбіны святкавалі адначасова, у апошняй дэкадзе снежня. У той час Марыя ўжо два месяцы як насіла пад сэрцам ужо другога свайго сынка, пра што ніхто, у тым ліку і яна, не здагадваўся.

Жылі маладыя ў прыватным доме, які належаў бабулі Міхаіла, а разам з імі жыхарамі яго былі дзядзька, маці, брат Міхаіла з жонкай і дзеці. Вялікая сям'я. Трымала яна сваю гаспадарку, жыла і не багата, і не бедна. Марыя ж, вядома, не працавала, бо знаходзілася ў дэкрэтным водпуску і займалася сваім малым. Па натуры была яна спакойнай, ураўнаважанай, чулай. Ніколі не злавалася, а свайго першынца вельмі любіла. Адно негатыўнае, што за ёй заўважалі — гэта курэнне. А што замкнёнасць у характары была, дык на гэта як паглядзець.

У лютым 2007 года Марыя адчула пэўныя змены ў сваім арганізме, якія сведчылі: яна цяжарная. Ды і набуханне жывата гаварыла само за сябе. Каб ніхто не здагадваўся, што з ёй адбываецца, яна пачала насіць спартыўны касцюм і іншае адзенне, якое, на яе думку, павінна было схаваць яе «цікавае становішча». Але ж не схаваеш шыла ў мяшку? Не, зразумела. Першай пытанне задала маці. Адказ быў такі: усё нармальна, пройдзе. Ёсць некаторыя праблемы па гінекалагічнай лініі.

Не абышлі падобнымі пытаннямі Марыю суседзі і знаёмыя. Маладая жанчына то ў жарт апавядала ім, што, маўляў, аб'елася салодкага, што не працуе, што ў яе няма ніякіх клопатаў і па гэтай прычыне шмат часу спіць, і ў яе развіўся мядзведжы апетыт. То ўсур'ёз казала, што ў яе такое захворванне, як міёма, і гэтае таямнічае слова прымушала цікаўных задумацца: а што гэта такое? Калі ж спасылалася на запаленчыя працэсы і захворванні ўнутраных органаў, дык людзі думалі: усё можа быць.

Вядома ж, Марыі раілі пракансультавацца ў дактароў, і яна казала, што рабіла гэта і нават называла прозвішча аднаго ўрача, які сказаў: усё ў парадку, так і павінна быць пэўны час, а пасля ўсё стане на свае месцы. Насамрэч, ні да каго яна не звярталася.

У адрозненне ад сваіх родзічаў надзьмуты жывот сваёй жонкі Міхаіл заўважыў толькі... у ліпені, аб чым даваў паказанні як у час следства, так і на судзе. Яму Марыя адказала: гэта вынік праблемы па жаночай частцы, а ніякая не цяжарнасць, бо яны ж у інтымныя моманты засцерагаюцца патрэбнымі сродкамі. І ён верыў ёй.

Між тым ішоў ужо дзявяты месяц цяжарнасці. У доме бабулі адзначалі Дзень работнікаў гандлю (Міхаіл працаваў грузчыкам у адным гандлёвым прадпрыемстве абласнога цэнтра). Ён лёг спаць у 22 гадзіны, і Марыя таксама з ім была ў адным ложку. А ў дзве гадзіны ночы яна адчула рэзкія болі ў жываце і зразумела: пачаліся схваткі. Асцярожна ўстала і накіравалася ў лазню, якая была прыбудавана да хаты, і там у мыйным аддзяленні праз пяць хвілін нарадзіла хлопчыка, даўжыня цела якога, як выявілася пасля, была 54 сантыметры.

Што рабіць з ім, не думала. Усё было вырашана даўно, таму і ўтойвала сваю цяжарнасць ад усіх. Нованароджаны заходзіўся плачам некалькі хвілін, але ў доме ўсе моцна спалі, і той плач чула толькі суседка, аб чым Марыя і не падазравала. Яна загарнула немаўлятка ў нейкую майку, якая трапіла ёй пад рукі, вымыла падлогу, прывяла сябе ў парадак і выйшла з дзіцем на вуліцу. Накіравалася яна да возера, якое знаходзілася ў пяці—шасці хвілінах хады.

Мінуўшы мост праз ручай, які збягаў па канаве, зарослай кустамі, да возера, падумала, што лепшага месца, каб пакінуць тут малога, не знайсці. Спусцілася ўніз па вузенькай сцяжынцы і, убачыўшы ў канаве кавалак размоклай фанеры, паклала голенькага хлопчыка на яе. Пастаяла крыху ў роздуме і, упэўніўшыся ў тым, што ахвяра голасу не падае, накіравалася дадому. Там па-ранейшаму было ўсё ціха. Яна ўладкавалася ў ложку каля Міхаіла і моцна заснула. Справа была зроблена...

Раніцай усе заўважылі: у Марыі жывата няма! Знікла паўната! Вось гэта дзівосы! А яна спакойна патлумачыла: а што гаварыла раней? Пра гэта ж і казалі медыкі. Узгадайце. Дык вось, ноччу ў яе быў крывацёк, і з жывата быццам нешта выйшла. Лёгка цяпер. Аб гэтым жа — і ўсім астатнім, хто ўбачыў такую метамарфозу.

Трупік хлопчыка, які пачаў разлагацца, заўважыў адзін мясцовы чалавек праз дваццаць дзён, калі вяртаўся з пляжа, і адразу ж патэлефанаваў у міліцыю. Тая ўзяла на падазрэнне жанчын, якія павінны былі нараджаць у пазначаныя тэрміны, ды толькі ўсё дарэмна. І толькі пасля гэтага дабраліся да зламысніцы. Тая спачатку ўсё адмаўляла, але ж куды падзенешся, калі былі здабыты неабвержныя доказы злачынства ў час следства. Іх было многа, у тым ліку і вывады генетыкаскапічнай экспертызы на ДНК як самой падазронай, так і Міхаіла — аб тым, што верагоднасць мацярынства і бацькоўства іх у дачыненні да немаўляці складае 99,9 працэнта. Апошні ж сцвярджаў, што гэта не іхняе дзіця.

Сваё злачынства 20-гадовая Марыя Сазонава спрабавала растлумачыць тым, што, маўляў, яна баялася бабулі Міхаіла, якая пагражала прагнаць іх абаіх на кватэру, калі з'явіцца яшчэ адно дзіця. Хлусня ўсё гэта. Як хлусня і тое, што яна не хацела смерці сына, таму і паклала яго ў ажыўленым месцы на фанеру, каб хто-небудзь заўважыў і ўзяў да сябе. Нішто сабе ажыўленае месца, да якога выпадкова дабраліся толькі праз дваццаць дзён!

Прыгавор, які ўвайшоў у законную сілу, утрымлівае ў сабе наступныя словы: «Марыя Сазонава вінаватая ў наўмысным супрацьпраўным пазбаўленні жыцця заведама малалетняга, які знаходзіўся ў бездапаможным стане». Яна асуджана на восем гадоў знаходжання ў папраўча-працоўнай калоніі агульнага рэжыму. А верыць цяпер ці не верыць у яе дзікае злачынства Міхаіл і ці будзе ён чакаць выхаду Марыі з калоніі на волю, мы не ведаем...

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**




# Высяленне з інтэрната — у судовым парадку

***Мяне звальняюць у сувязі з тым, што я не згадзіўся са змяненнем істотных умоў працы (графіка работы) па пункце 5 артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Ці выселяць мяне пры гэтым з інтэрната? Можа я маю права захаваць за сабой жылую плошчу ў інтэрнаце. У калектыўным дагаворы ніякіх ільгот на гэты выпадак не прадугледжана. А як па заканадаўстве?***

**Андрэй,** *г. Брэст*

Парадак і падставы высялення з інтэрнатаў прадугледжаны Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь і Палажэннем аб інтэрнатах, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.09.1999 г. № 1437 (у рэдакцыі пастановы ад 14.12.2005 г. № 1441).

Згодна з імі, сезонныя, часовыя работнікі і грамадзяне, якія працавалі па тэрміновым працоўным дагаворы і спынілі работу, а таксама грамадзяне, якія вучыліся ў навучальных установах і выбылі з іх, падлягаюць высяленню з інтэрната, якім яны былі забяспечаны ў сувязі з работай, вучобай, без забеспячэння іншым жылым памяшканнем.

Іншыя работнікі, якія пасяліліся ў інтэрнаце ў сувязі з работай, могуць быць выселены без забеспячэння іншым жылым памяшканнем у выпадках звальнення па ўласным жаданні без уважлівых прычын або звальнення за парушэнне працоўнай дысцыпліны ці ўчыненне злачынства, а таксама ў выпадку забеспячэння гэтых асобаў іншым жылым памяшканнем у гэтым населеным пункце.

З інтэрната не могуць быць выселены без забеспячэння іншым жылым памяшканнем грамадзяне, якія спынілі работу па іншых падставах, а таксама грамадзяне, якія адпрацавалі ў арганізацыі, што забяспечыла іх інтэрнатам, не менш за дзесяць гадоў; грамадзяне, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, прафесійнага захворвання, атрыманых пры выкананні вытворчых або службовых абавязкаў; грамадзяне, звольненыя ў сувязі з ліквідацыяй арганізацыі або па скарачэнні колькасці ці штату работнікаў; інваліды I і II групы; грамадзяне, якія маюць права на працоўную пенсію па ўзросце (у тым ліку на льготных умовах), а таксама за выслугу гадоў і іншыя катэгорыі грамадзян, якія прадугледжаны артыкулам 96 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне, якія пасяліліся ў інтэрнаце па хадайніцтве іншай арганізацыі, падлягаюць высяленню з інтэрната без забеспячэння іншым жылым памяшканнем пасля заканчэння тэрміну дзеяння дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнаце або пасля спынення працоўных адносінаў незалежна ад падстаў з арганізацыяй, якая хадайнічала аб забеспячэнні інтэрнатам. На гэтых грамадзян не распаўсюджваюцца гарантыі, пералічаныя ў папярэднім абзацы.

Пункт 5 артыкула 35 Працоўнага кодэкса не пералічаны ў ліку падстаў, пры звальненні па якіх работнік падлягае высяленню без забеспячэння іншым жылым памяшканнем. Тым не менш ваша сітуацыя патрабуе ўважлівага падыходу. Так, невядома, на чыім балансе знаходзіўся інтэрнат, тэрміновы працоўны дагавор у вас быў ці не і да т.п.

Як вызначана пунктам 56 Палажэння аб інтэрнатах, высяленне з інтэрнатаў робіцца ў судовым парадку. Дапускаецца высяленне ў адміністрацыйным парадку з санкцыі пракурора толькі асобаў, якія жывуць у інтэрнатах, што пагражаюць абвалам. На патрабаванні аб высяленні з інтэрнатаў па падставах спынення працоўных адносінаў распаўсюджваецца трохгадовы тэрмін іскавай даўніны, які вылічваецца з дня спынення працоўных адносінаў з асобай, якая гэтым жылым памяшканнем была забяспечана.

# Скажы СНІДу — Не!

**Аўтапрабег «Скажы СНІДу — Не!», арганізатарам якога з'яўляецца ААТ «Сімага Медыа», стартаваў у Гродне.**

Гэта акцыя пройдзе ў пяці абласных цэнтрах Беларусі і завяршыцца канцэртам у Віцебску 17 мая, у Міжнародны дзень памяці памерлых ад СНІДу. У ходзе аўтапрабегу распаўсюджваюцца інфармацыйна-адукацыйныя матэрыялы па праблемах прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі, праходзяць прэс-канферэнцыі і сустрэчы моладзі з прадстаўнікамі Беларускага згуртавання людзей, якія жывуць з ВІЧ, тэматычныя канцэрты з удзелам Аляксея Шадзько, Аляксандра Патліса, дуэта «Аляксандра і Канстанцін», музыкантаў з абласных цэнтраў.

У рамках акцыі ў Гродне адкрылася арганізаваная Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа і згуртаваннем людзей, якія жывуць з ВІЧ, выстаўка-інсталяцыя «Горад, у якім жывуць ЛЮДЗІ...». Яна аформлена ў выглядзе гарадскіх вуліц (фасады дамоў, якія выкананы з аргшкла, вадасцёкавыя трубы, вяроўкі для бялізны ў імправізаваным дворыку). Вобразы гараджан — у выглядзе маек-плакатаў, якія выраблены людзьмі, што жывуць з ВІЧ (22 работы). На майках — малюнкі і надпісы, большасць — аптымістычныя і жыццесцвярджальныя. Дэманструюцца таксама дзённікавыя запісы — пісьмовыя пасланні гэтых людзей.

— Выстава сведчыць пра тое, што ВІЧ-інфіцыраваныя людзі — такія ж грамадзяне нашай краіны, як і ўсе. Яны ўмеюць жыць паўнацэнным актыўным жыццём, тварыць, клапаціцца аб сваім здароўі і здароўі іншых людзей, — гаворыць Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Віктар Калбанаў. — І ў той жа час выстава — гэта папярэджанне аб небяспецы захворвання, якое можа змяніць жыццё і лёс любога чалавека.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Іграць — дык іграць... у оперным!

**Нацыянальны тэатр оперы і балета ўзяўся за працу і актыўна запрашае слухачоў. Не на экскурсію, хоць і сапраўды цікава паглядзець, што змянілася ў тэатры пасля рамонту. Але нагодай для прыходу ў тэатр можа стаць заяўлены канцэрт фартэпіяннай класікі.**

У канцэрце рускай сімфанічнай музыкі разам з аркестрам пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Украіны Віктара Пласкіны будзе выступаць не хто-небудзь, а Расціслаў Крымер, малады дырэктар і мастацкі кіраўнік міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета. Толькі цяпер Расціслаў Крымер будзе паказваць сваё майстэрства як піяніст, лаўрэат міжнародных конкурсаў у Польшчы, Францыі, Германіі, Шатландыі, Італіі і іншых. Ён выступае за межамі Беларусі з вядомымі музыкантамі і калектывамі. Вядома — вучыўся ў вышэйшай школе музыкі Кёльна і ў аспірантуры Каралеўскай акадэміі музыкі ў Лондане. Але і ў сваёй краіне трэба пра сябе нагадваць не толькі гучнымі фестывалямі. Тым больш, што навучанне пачыналася тут — у мінскім Рэспубліканскім вучэбным комплексе гімназія-каледж. Іграць — так іграць... Першы канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Чайкоўскага — самы дасканалы твор з усяго, што напісана для раяля, так лічыў Сяргей Танееў. Дарэчы, менавіта яму, вялікаму музыканту, настаўніку прысвяціў сваю Другую сімфонію Сяргей Рахманінаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПАСАДКА НОВЫХ ДРЭЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Напярэдадні Сусветнага дня навакольнага асяроддзя, які адзначаецца ва ўсім свеце 5 чэрвеня, ААН выступіла з новай глабальнай ініцыятывай: пасадзіць сем мільярдаў новых дрэў да канца гэтага года. Для рэалізацыі гэтай мэты прапаноўваецца актыўна выкарыстаць магчымасці сеткі інтэрнэт.**

Па звестках Праграмы ААН па навакольным асяроддзі (ЮНЕП), ужо ў 166 краінах пасаджана каля 3,1 мільярда новых дрэў. «Мы хочам пасадзіць сем мільярдаў дрэў да пачатку правядзення вырашальнай сустрэчы па Канвенцыі ААН аб кліматычных зменах у снежні цяперашняга года, а без падтрымкі школ і асацыяцый, урадаў, дзелавых колаў і асобных грамадзян з задачай не справіцца», — заявіў дырэктар ЮНЕП Ахім Штэйнэр. У ААН лічаць, што калі нават палова жыхароў планеты пасадзяць усяго па адным дрэве, то гэта стане «гучным напамінкам сусветным лідарам аб неабходнасці заключэння пагаднення па праблеме змены клімату».

**Леанід ТУГАРЫН.**

# «БЕЛКАМУНМАШ» ЗАКЛЮЧЫЎ КАНТРАКТ АБ ПАСТАЎЦЫ 21 ТРАЛЕЙБУСА Ў БІШКЕК

**Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама мэр Бішкека Нарыман Цюлеў.**

— Калі будуць выконвацца ўмовы кантракта, мы кожны год будзем купляць у «Белкамунмаша» па 20—25 тралейбусаў. Акрамя таго, мы зацікаўленыя ў пастаўцы спецыяльнай камунальнай тэхнікі.

**Наталля ЗАЯЦ,** *«Мінск—Навіны».*

# УВАГА, МАТАЦЫКЛІСТ-ПАРУШАЛЬНІК!

**19-гадовы хлопец, які кіраваў матацыклам без вадзіцельскага пасведчання, пры выездзе на галоўную дарогу сутыкнуўся з «Фольксвагенам» і загінуў. Няшчасце адбылося на тэрыторыі Рэчыцкага раёна.**

Статыстыка сведчыць, што гінуць не толькі самі парушальнікі, якія ездзяць на мотатранспарце без вадзіцельскага пасведчання, без шлема, у стане алкагольнага ап'янення, але з-за іх церпяць і ні ў чым не вінаватыя людзі.

— Толькі за 4 месяцы гэтага года па віне кіроўцаў мотатранспарту здзейснена 72 дарожна-транспартныя здарэнні (у 22 з гэтых выпадкаў матацыклісты былі ў стане алкагольнага ап'янення), падчас якіх загінула 9 чалавек, 71 чалавек атрымаў раненні, — паведаміў **начальнік службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» МУС Яўген ЛАПЕЦ**. — Заклікаем мотааматараў не ігнараваць Правілы дарожнага руху, а аўтааматарам рэкамендуем падчас руху не забывацца глядзець у люстэркі задняга віду, праяўляць асцярожнасць пры з'яўленні на дарозе матацыклістаў, веласіпедыстаў і скутэрыстаў.

**Надзея ДРЫЛА.**

# «МЯНЯЛА» СТРАЦІЎ БУЙНУЮ СУМУ

**Вялікія грошы па ўласнай віне страціў 43-гадовы гродзенец: яго «цёпленькім» у Гродне затрымалі за парушэнне парадку правядзення валютных аперацый супрацоўнікі аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнай злачыннасцю Ленінскага РАУС і інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у непрацуючага мужчыны праваахоўнікамі была канфіскавана буйная сума, якую ён падрыхтаваў для незаконных здзелак. У прыватнасці, «валютчык» адразу «пабяднеў» на 16,2 мільёна беларускіх рублёў, 121 тысячу расійскіх, 4,8 тысячы долараў ЗША і 11,6 тысячы еўра.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# БАЦЬКА НА СЫНА

У бальніцу прывезлі 25-гадовага жыхара Лунінца з перарэзанай соннай артэрыяй. Аператыўнікі вызначылі, што замах на забойства зрабіў бацька параненага, які падчас начнога скандалу ў п'яным стане ўдарыў сына кухонным нажом у шыю.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ЦІ ПАВІННЫ БАЦЬКІ МАЛАЛЕТНІХ ЗЛАЧЫНЦАЎ КАМПЕНСАВАЦЬ ВЫДАТКІ НА ІХ УТРЫМАННЕ Ў КАЛОНІЯХ?

**Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч выказаў меркаванне, што ў нашым заканадаўстве мэтазгодна прадугледзець такі пункт. Толькі гаворка там павінна ісці выключна аб тых бацьках, якія не займаліся выхаваннем дзяцей, — п'янствавалі, вялі амаральны лад жыцця, паказвалі дрэнны прыклад сваімі паводзінамі.**

Падобная практыка маецца ў некаторых еўрапейскіх краінах. У нас жа бацькі кампенсуюць выдаткі дзяржаве толькі ў выпадку змяшчэння дзіцяці ў інтэрнатную ўстанову. Пры асуджэнні няпоўнагадовага, у тым ліку і таго, хто знаходзіўся ў інтэрнаце, і накіраванні яго ў выхаваўчую калонію такога абавязку няма.

Штомесяц дзяржава затрачвае на аднаго няпоўнагадовага, які адбывае пакаранне ў калоніі, 440 тысяч беларускіх рублёў. Усяго ж у месцах пазбаўлення волі знаходзіцца каля 300 малалетніх злачынцаў.

Генпракурор лічыць, што трэба развіваць беларускае заканадаўства — прадугледзець правіла, згодна з якім адначасова з вынясеннем прыгавору малалетняму злачынцу вырашалася б пытанне аб кампенсацыі выдаткаў нядбайнымі бацькамі за знаходжанне іх дзяцей у выхаваўчых калоніях.

**Надзея ДРЫЛА.**

**11 июня 2009 года в 11.00 состоится очередное общее собрание акционеров ЗАО «Припутник» по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, д. 1, конференц-зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Приобретение ЗАО «Припутник» акций ЗАО «Припутник».

С документами Общества, относящихся к повестке дня, можно ознакомиться в приемной директора ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Форма проведения собрания очная, форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая.

УНН 100071629

**4 июня 2009 года в 15.00 в актовом зале административно-бытового корпуса состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Свитанак», расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1.**

**Повестка дня:**

1. Увеличение Уставного фонда ОАО «Свитанак» г. Жодино путем увеличения номинальной стоимости акции за счет собственных средств.
2. Изменения в Устав ОАО «Свитанак» г. Жодино.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 2009 год 21.05.09 г.

УНП 600038919

КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 8 (608)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❒ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Вілейцы.
Тэл. 8 029 692 46 54.

❒ Два пакоі на агульнай кухні, прыватызаваныя, у Мінску, $24 500, торг.
Тэл.: 8 029 189 02 80, 8 017 295 02 80, пасля 16.00.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 41 кв. м, 1-ы паверх, у г. Оршы, з усімі выгодамі.
Тэл.: 8 029 517 41 82, 8 0216 29 52 92.

❒ Дом зрублены 12х8, хлеў 8х9, 4 км ад г. Любані Мінскай вобласці, магчыма пад знос. $4 тыс., ці абмяняю на Т-25.
Тэл. 8 01718 33 433.

❒ Запрашаю сям'ю без ш/звычак да будоўлі 2-кватэрнага дома, для будоўлі маецца ўсё, 10 км ад Брэста.
Тэл. 0 29 206 70 61.

❒ «Мерседэс-123» 2,4Д, 1983 г.в., фаркоп, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 029 723 06 67.

❒ Воз на «гумавым ходу», вупраж, швейная машынка «Зінгер» нажная. Звяртацца: 222455, Вілейскі р-н, в. Шляпы. Шабан У.В.

❒ «Масквіч-2140» і ЗАЗ-968М, танна.
Тэл. 8 033 300 74 72.

❒ «Аўдзі-100», 1993 г.в. 2,0 газ/бензін, белы, ц/замок, сігнал. $5100, торг, добры стан.
Тэл. 8 029 639 86 53.

❒ РАФ і камплект з/ч да яго.
Тэл. 8 01772 51 498.

❒ МТЗ-50 экспартны варыянт.
Тэл. 8 029 965 83 33.

❒ Біблія за 5000 руб.
Тэл. 8 0212 25 80 79.

❒ Кабан жывой вагой у Чэрвеньскім раёне, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 0171 43 28 93.

❒ «Пежо-806», міні-вэн», 1,9 ТДі — 5950 у.а., «VW-Дысета», 1991 г.в. 1,6 бензін — 2600 у.а.
Тэл. 8 033 634 86 60.

❒ «Аўдзі-80», 1988 г.в. 1,8, седан. 3100 у.а.
Тэл. 8 029 507 88 19.

❒ «Аўдзі А6», 1996 г.в. 2,5 ТД, універсал, ц/замок, эл. пакет, добры стан.
Тэл. 8 033 634 86 60.

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 400 43 16.

❒ Эл. пліта «Гефест», шклокерамічная, $600.
Тэл. 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

***КУПЛЮ***

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 114 50 29.

***РОЗНАЕ***

❒ Здаю пакой у прыватным доме (на лета), 50 км ад Мінска, побач лес, агарод.
Тэл. 8 017 207 20 13.

❒ Рэпетытар па рус. і бел. мовах.
Тэл. 8 017 294 13 38.

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ПУЦЯТА Сяргея Аляксандравіча**, 16 студзеня 1972 года нараджэння, ураджэнца г. Рэчыца Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства якога: вул. Леніна, д. 240, кв. 2, г. Рэчыца Гомельскай вобл. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Пуцяту Сяргея Аляксандравіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, д. 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **БЕЛАН Аксаны Уладзіміраўны**, 16 студзеня 1970 года нараджэння, ураджэнкі г. Гомеля, апошняе вядомае месца жыхарства якой: вул. Міцкевіча, д. 10, г. Рэчыца Гомельскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Белан Аксану Уладзіміраўну, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, д. 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя____ № _______________ Выдадзены________________________________

Подпіс_______________________ Дата_________________________

## ЦЯЖАРНЫХ КУРЫЛЬШЧЫЦ ПАД КАНТРОЛЬ

**Усё больш жыхароў Віцебскай вобласці звяртаюцца да нарколагаў з мэтай кінуць курыць.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **намеснік галоўнага ўрача па наркалогіі Віцебскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Ігар СВІРКУНОЎ**, летась было зарэгістравана каля 1 тысячы зваротаў. Па звестках медыкаў дыспансэра, колькасць такіх пацыентаў штогод павялічваецца стабільна на чвэрць.

Працэнтаў 30 з тых, хто прайшоў поўны курс лячэння, дакладна пазбавіліся ад гэтай шкоднай звычкі. Кошт ананімнага лячэння ў дыспансэры — 50—60 тысяч рублёў. Яно можа доўжыцца да некалькіх тыдняў.

— На жаль, пакуль што мы не можам дакладна пракантраляваць, ці кінулі курыць усе грамадзяне, якія звярнуліся да нас па дапамогу, — кажа Ігар Свіркуноў, — бо яны не знаходзяцца ў адрозненні ад хранічных алкаголікаў і наркаманаў на спецыяльным уліку. Наконт статыстыкі, магу адзначыць — курыць кожная пятая жанчына, 64 працэнты мужчын, 45 працэнтаў моладзі ва ўзросце да 25 гадоў...

Каб больш эфектыўна весці барацьбу з курэннем, медыкі гатовы выступіць з наступнай ініцыятывай. Пры налічэнні і выплаце «дэкрэтных» грошай неабходна ўлічваць — ці курыць цяжарная. Вядома, курэнне негатыўна адбіваецца на нашчадках, ды і на здароўі самой жанчыны. Праўда, як пракантраляваць — ці кінула цяжарная курыць насамрэч — ужо асобнае пытанне.

На жаль, у рэгіёне няшмат прыкладаў, калі членам усяго калектыву забаронена курыць. Вось у вядомае прадпрыемства рэгіёна — «Віцебскаблгаз» — не бяруць на працу курцоў. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў, у прыватнасці, мясцовай тэлекампаніі, аказваюць тым, хто не курыць, штомесячную матэрыяльную дапамогу — у памеры некалькіх базавых велічынь.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Шчаслівая дарога



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Слуцкі раён.

# Травы як дапаможнае лячэнне пры атыце

## На першым годзе жыцця да 60 працэнтаў дзяцей хоць бы адзін раз хварэюць на сярэдні атыт

— Дзеці хварэюць так часта таму, што іх лор-органы маюць пэўныя анатама-фізіялагічныя асаблівасці, — кажа **ўрач-сурдолаг Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Ніна КАСЦЮК**, — у немаўлят кароткая і шырокая слыхавая труба, якая злучае насаглотку з вухам. І часта, калі дзіця смокча, вадкасць трапляе праз слыхавую трубу ў вуха. А гэта можа стаць прычынай вострага атыту. Узнікае моцны боль, закладае вуха, магчымы шум у ім. Акрамя таго павышаецца тэмпература, немаўля дрэнна есць, навідавоку сімптомы агульнай інтаксікацыі. Асноўнае лячэнне атыту — антыбіётыкі. Аднак калі навідавоку самыя пачатковыя сімптомы хваробы, яе можна будзе пралячыць мясцова, прызначыць той жа борны спірт, процізапаленчыя кроплі. Пры гэтым у якасці дапаможнага лячэння могуць прымяняцца травы.

### Унутр

Каб знізіць выражанасць сімптомаў інтаксікацыі, хвораму трэба даваць паболей піцця, прыгатаванага з пладоў і траў, якія ўтрымліваюць шмат вітаміну С. Напрыклад, морсы з брусніц, журавінаў, адвары пладоў шыпшыны, травы ваўчкоў і крапівы.

Паколькі даецца шмат піцця, трэба даць і мачагоннае. Хвошч палявы, ліст брусніц, корань пырніку, ядловец, спарыш, піжма, бярозавыя пупышкі. Агульную інтаксікацыю можна зменшыць, узмацніўшы вывядзенне таксінаў з потам. Потааддзяленне ўзмацняюць бузіна (кветкі), маліна (ліст, плады), парэчкі (ліст), ліпа (кветкі). Многія з гэтых раслін валодаюць сістэмным, супрацьзапаленчым дзеяннем, звязаным з наяўнасцю саліцылатаў. Да гэтай катэгорыі адносяць тавалгу, вярбу, сабельнік — яны валодаюць гарачкапаніжальным і абязбольвальным дзеяннем.

Травы, якія прызначаюць унутр, змешваюць у складзе збораў, зборы адварваюць і даюць піць у гарачым выглядзе з мёдам, калі на яго няма алергіі.

**Прыклад збору:**

*Ліпа сэрцападобная (кветкі) — 1 частка, маліна звычайная (ліст) — 1 частка, хвошч палявы (трава) — 1 частка, вярба казіная (кара) — 1 частка, бузіна чорная (кветкі) — 3 часткі.*

*Узяць адну сталовую лыжку збору на шклянку вады, 15 хвілін патрымаць на вадзяной бані. Даць адстаяцца 30 хвілін, працадзіць. Давесці да зыходнага аб'ёму кіпенем. Піць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень за паўгадзіны да яды, а яшчэ лепш па невялікім глытку праз кожную гадзіну.*

### Звонку

Ёсць некалькі народных рэцэптаў для закапвання ў вушы. Майце на ўвазе, што закапванні робяцца толькі на першай стадыі атыту, да прарыву гною праз барабанную перапонку. Часам бывае, што такіх закапванняў хапае, каб спыніць запаленне і пазбегнуць утварэння гною.

Агульныя патрабаванні: любыя кроплі павінны быць цёплымі, прыкладна 37 °С. Занадта халодныя кроплі могуць выклікаць моцнае галавакружэнне і рвоту, а гарачыя — яшчэ і апёк барабаннай перапонкі.

**Вось адзін з рэцэптаў:** *адшчыкнуць ад звычайнай пакаёвай чырвонай герані некалькі лісткоў. Выціснуць з іх сок. Закапаць у хворае вуха 3—4 кроплі і закрыць ваткай. Так рабіць 4—5 разоў на дзень.*

Моцным абязбольвальным дзеяннем валодае **алей блёкату** і **алей палыну**. У хатніх умовах можна прыгатаваць простую алейную выцяжку. Трэба ўзяць свежую расліну, здрабніць, заліць яе некалькімі часткамі алею, даць настояцца пару тыдняў. Для таго, каб атрымаць больш канцэнтраваны алей, можна заліць атрыманым алеем свежую порцыю травы.

Закапваць у вушы народная медыцына рэкамендуе **сок лісця вярбы**, **адвар кветак рамонку** (1 ст. лыжку на шклянку), **свежы сок часнаку** (па 2 кроплі за раз), **адвар травы хвашчу палявога**.

Да вонкавых мерапрыемстваў адносіцца таксама кампрэс на вуха з гарэлкай, разведзенай напалову. Правілы накладання кампрэсу такія. Узяць паўшклянкі гарэлкі, даліць да поўнай гатаванай цёплай вадой. Узяць марлевую сурвэтку, змачыць яе разведзенай гарэлкай і ўкласці вакол вушной ракавіны з хворага боку, пакідаючы слыхавы праход адкрытым.

На сурвэтку зверху накласці квадратны кавалак цэлафанавага пакета, які па плошчы павінен перакрыць сурвэтку. У цэлафане таксама прарaзаецца адтуліна для вуха. Далей прыкладаюць вялікі кавалак ваты і прыбінтоўваюць кампрэс звычайным марлевым бінтам ці бавоўнянай хусткай.

Кампрэс звычайна робяць на ноч. Замест гарэлкі лепш за ўсё выкарыстоўваць настойку кветак бузіны чорнай.

Пасля прарыву барабаннай перапонкі трэба рабіць рэгулярны туалет вонкавага слыхавога ходу.

Для лячэння вонкавага атыту прымяняюць прамыванні вонкавага слыхавога ходу цёплымі адварамі супрацьзапаленчых і антымікробных траў. Напрыклад, **календулы лекавай, шалфею лекавага, чабору, кары дуба, суплоднай вольхі**. Можна прымяняць спіртавыя настойкі гэтых траў у выглядзе некалькіх кропель на 1/3 шклянкі вады.

З простых сродкаў хатняй аптэчкі можна выкарыстаць анілінавыя фарбы (брыльянтавы зялёны, метыленавы сіні, фукарцын), 3-працэнтны пераксід вадароду, фурацылін.

Туалет вонкавага слыхавога праходу пры вонкавым атыце трэба праводзіць не радзей як 2—3 разы на дзень. Паслядоўнасць дзеянняў такая. Спачатку адварам супрацьмікробнай травы прамыць слыхавы праход. Затым ватнай турундай старанна прасушыць. Змазаць ачаг паражэння зялёнкай.

**Вольга ШАЎКО.**

## МІННАЕ ПОЛЕ Ў ЦЭНТРЫ ВЕТКІ

абясшкоджана. Днём, падчас капання траншэі пры правядзенні работ па пракладцы камунікацый у горадзе з 8-тысячным насельніцтвам, рабочыя нечакана натрапілі на нейкія прадметы, падобныя на снарады. Адразу ж былі зроблены захады для забеспячэння бяспекі грамадзян: прылеглая да знаходкі тэрыторыя была ацэплена міліцыяй, а пяць чалавек з бліжэйшых прыватных дамоў эвакуяваныя. Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, калі прыехалі сапёры групы размініравання з Гомеля, высветлілася, што ў гэтым месцы знаходзілася 77 іржавых, значна пашкоджаных мінамётных мінаў і артылерыйскіх снарадаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Адразу ж пасля правядзення мерапрыемстваў па абясшкоджванні ў гэтым месцы сапёры былі выклікаsucceeded ў Свяцілавічы Веткаўскага раёна, дзе таксама быў знойдзены баявы снарад. На гэты раз толькі адзін.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

36,6°

# ЦІ АБАРОНІЦЬ ПРЫШЧЭПКА АД МЕНІНГІТУ?

**Падчас правядзення ў Беларусі Еўрапейскага тыдня імунізацыі ў Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі была арганізавана «гарачая лінія» па пытаннях імунапрафілактыкі. Прапануем нашым чытачам адказы спецыялістаў сталічнай санэпідслужбы на пытанні, якія могуць зацікавіць многіх бацькоў, асабліва тых, якія не да канца разумеюць важнасць прышчэпак.**

***— Ці можна прышчапляць дзіця адразу ад трох інфекцый? Магчыма, лепш рабіць прышчэпкі з інтэрвалам хоць бы ў некалькі дзён?***

— Імунная сістэма дзіцяці здольная вырашаць адразу некалькі пастаўленых перад ёй задач без шкоды для яго здароўя, асабліва калі мікраарганізмы ці вірусы «аслаблены» і пазбаўлены магчымасці выклікаць інфекцыйнае захворванне. А калі вы вырашыце зрабіць тры прышчэпкі ў розныя дні, то вам давядзецца наведваць паліклініку тры разы, а, значыць, вы ўтрая павялічыце рызыку сустрэчы немаўляці з дзікімі ўзбуджальнікамі, якія выклікаюць інфекцыйныя захворванні, напрыклад з ВРВІ. Усё ж такі ў паліклініку прыходзяць не толькі здаровыя, але і хворыя дзеткі. Між іншым, сустрэча з дзікімі ўзбуджальнікамі наносіць шкоду не толькі імуннай, але і іншым сістэмам арганізма. Да таго ж лішнія медыцынскія маніпуляцыі (замест аднаго тры ўколы) — гэта дадатковы стрэс для дзіцяці.

***— Чакаем у сям'і папаўненне. Параіліся з мужам і вырашылі адмовіцца ад прышчэпак, якія робяць дзіцяці ў радзільным доме. Хацелі б распачаць вакцынацыю, калі немаўляці споўніцца хоць бы 3-4 месяцы, а можа і яшчэ пазней...***

— Пачынаць прышчапляць дзяцей пазней немэтазгодна, асабліва гэта датычыцца прышчэпак супраць віруснага гепатыту В. Нованароджаны можа заразіцца ім і ад маці, і ў сям'і — на сто працэнтаў гэту рызыку выключыць немагчыма. А востры вірусны гепатыт В, які ўзнікае ў перыяд нованароджанасці, у 90 працэнтах выпадкаў пераходзіць у хранічную форму. На жаль, але адзінкавыя выпадкі хранічнага гепатыту В у дзетак, якім прышчэпкі супраць гепатыту В былі зроблены ў больш позні час, назіраюцца. Прычым канкрэтныя крыніцы інфіцыравання вызначыць не ўдалося. Але ў любым выпадку рашэнне застаецца за бацькамі. І калі яны пачнуць прышчапляць дзіця ў больш познім узросце, то прышчэпкі трэба праводзіць у тым жа парадку, і з тымі ж інтэрваламі, што прадугледжаны Нацыянальным календаром прышчэпак.

***— Падкажыце, калі ласка, ці можна прышчапіцца ад менінгіту?***

— Менінгіт могуць выклікаць розныя ўзбуджальнікі: як бактэрыі (пнеўмакокі, менінгакокі, гемафілы), так і вірусы. Сучасныя вакцыны дазваляюць папярэдзіць вышэйпералічаныя бактэрыяльныя менінгіты.

Для папярэджвання менінгакокавых менінгітаў, якія выклікаюцца ўзбуджальнікамі груп А і С, выкарыстоўваецца вакцына «Менінга А+С» французскай вытворчасці. У нашай краіне пэўная колькасць менінгакокавых менінгітаў выклікаецца менавіта гэтымі відамі, таму вакцына «Менінга А+С» уводзіцца толькі тым дзеткам, якія былі ў кантакце з хворымі. Пры наяўнасці эпідэмічных паказанняў вакцына «Менінга А+С» даступная на бясплатнай аснове ў мінскіх паліклініках.

Для папярэджвання гемафільных менінгітаў выкарыстоўваюцца розныя вакцыны супраць Хіб-інфекцыі : французская «Акт-Хіб», бельгійская «Хіберыкс» і французскія вакцыны «Тэтр-Акт-Хіб (супраць коклюшу, дыфтэрыі, слупняку і Хіб-інфекцыі) і «Пентаксім» (супраць коклюшу, дыфтэрыі, слупняку, поліяміэліту і Хіб-інфекцыі). Гэтыя вакцыны можна атрымаць як на бясплатнай аснове ў паліклініках горада («Тэтр-Акт-Хіб»), так і на платнай аснове (усе іншыя).

Для папярэджвання пнеўмакокавых менінгітаў у нашай краіне выкарыстоўваецца вакцына «Пнеўма 23» французскай вытворчасці. Гэта вакцына даступная на бясплатнай аснове ў паліклініках горада дзецям, якія адносяцца да групы рызыкі, і на платнай аснове — усім ахвотным. Варта адзначыць, што ўсе вышэйпералічаныя вакцыны папярэджваюць не толькі менінгіты, але і іншыя не менш цяжкія наступствы гэтых інфекцый (сэпсіс, пнеўманію і г.д.)

***— Падкажыце, калі ласка, ці мэтазгодна рабіць дзіцяці прышчэпку супраць ветраной воспы? І калі так, то ў якім узросце?***

— Прышчэпку супраць ветраной воспы можна рабіць дзеткам з ўзросту 9-12 месяцаў. Найбольш мэтазгодна зрабіць прышчэпку перад паступленнем дзіцяці ў дзіцячую ўстанову, дзе істотна ўзрастае рызыка заражэння гэтай інфекцыяй. Майце на ўвазе, што ўспрымальнасць да ветраной воспы вельмі высокая: нават адзін выпадак гэтай інфекцыі ў дзіцячым калектыве заўсёды цягне сярод кантактных дзяцей наступныя выпадкі захворванняў. На жаль, апошнім часам назіраецца тэндэнцыя пачашчэння цяжкіх формаў ветраной воспы ў выглядзе ветранога энцэфаліту (паражэння галаўнога мозга). У цяжкай форме ветраная воспа працякае ў дзяцей з аслабленым імунітэтам. У асобных выпадках пасля перанесенай ветраной воспы вірус захоўваецца ў дрымотным стане ў нервовых клетках і ў будучыні можа актывізавацца, выклікаўшы такое цяжкае захворванне, як апярэзваючы лішай. У Беларусі зарэгістраваныя і дапушчаны да прымянення дзве вакцыны для папярэджвання ветраной воспы: «Варылікс» вытворчасці Бельгіі і французская «Акавакс». Схема вакцынацыі складаецца з адной ці двух прышчэпак у залежнасці ад узросту таго, хто прышчапляецца. Дзецям з 9 месяцаў да 13 гадоў для фарміравання працяглай і моцнай аховы дастаткова аднаразовага ўвядзення вакцыны. Падлеткам ва ўзросце 13 гадоў і больш старэйшым, а таксама дарослым неабходна зрабіць дзве прышчэпкі з інтэрвалам у 6 тыдняў. Трэба заўважыць, што ў выпадку кантакту дзіцяці з хворым на ветраную воспу мэтазгодна як мага хутчэй зрабіць прышчэпку для папярэджвання развіцця інфекцыі: найбольшы эфект дасягаецца, калі прышчэпку зрабіць на працягу трох сутак з моманту кантакту з хворым.

У многіх краінах вакцынацыя дзяцей супраць ветраной воспы праводзіцца ў рамках календара прафілактычных прышчэпак. Такая магчымасць разглядаецца і ў нас. Але пакуль зрабіць прышчэпку супраць ветраной воспы магчыма толькі на платнай аснове ў цэнтры вакцынапрафілактыкі дзіцячай інфекцыйнай клінічнай бальніцы (тэлефон 258 76 12) ці ў камерцыйных медыцынскіх цэнтрах.

***— Магчыма, вы ведаеце, ці праводзяць у Беларусі вакцынацыю дзяўчат супраць вірусу папіломы чалавека? У Расіі такія прышчэпкі робяць у Маскоўскай вобласці...***

— У нашай краіне вакцынацыя супраць вірусу папіломы чалавека (ВПЧ-інфекцыі) праводзіцца пакуль толькі на платнай аснове, хоць у перспектыве плануецца ўключэнне імунізацыі супраць ВПЧ-інфекцыі ў Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак.

Для правядзення прышчэпак у Беларусі зарэгістраваныя і выкарыстоўваюцца дзве вакцыны: «Цэрварыкс» (Бельгія) і «Гардасіл» (ЗША). Абодва прэпараты даказалі сваю высокую эфектыўнасць у фарміраванні імунітэту супраць ВПЧ-нфекцыі, у прыватнасці, раку шыйкі маткі і іншых формаў анкалагічных захворванняў. Прышчэпкі з выкарыстаннем гэтых вакцын добра пераносяцца як дзецьмі, так і дарослымі. Найбольш мэтазгодна прышчапляць супраць ВПЧ-інфекцыі дзяўчат яшчэ да іх «сэксуальнага дэбюту». Аднак вакцынацыя эфектыўная і пасля пачатку палавога жыцця. Схема вакцынацыі складаецца з трох прышчэпак: у любы абраны дзень, затым праз месяц-два пасля першай прышчэпкі (у залежнасці ад вакцыны, што была выкарыстана) і праз 6 месяцаў пасля першай прышчэпкі.

***— Ці можа заразіцца непрышчэпленае дзіця той інфекцыяй, ад якой нядаўна прышчапілі іншае дзіця, калі яны па некалькі гадзін у дзень кантактуюць у дзіцячым калектыве?***

— Пры ўвядзенні інактываваных вакцын і анатаксінаў магчымасць заражэння кантактных дзяцей з прышчэпленым дзіцем адсутнічае, паколькі ў вакцыне (анатаксіне) адсутнічае жывы ўзбуджальнік. Пры ўвядзенні вакцыны супраць адзёру, эпідэмічнага паратыту і краснухі, якая ўтрымлівае жывыя вірусы, магчымасць заражэння таксама адсутнічае. Доказам з'яўляюцца працяглыя навуковыя даследаванні. У апошнія гады пры выяўленні выпадкаў адзёру і краснухі прымяняюцца методыкі, якія дазваляюць выдзеліць вірус. Затым адбываецца яго дэталёвае вывучэнне, у тым ліку на генетычным узроўні. Вынікі такога даследавання дазваляюць беспамылкова меркаваць аб паходжанні вірусу. Выпадкаў выдзялення вірусаў вакцыннага паходжання ні на тэрыторыі нашай краіны, ні на тэрыторыі іншых краін не было!

У мінулым стагоддзі, сапраўды, рэгістраваліся выпадкі заражэння вакцынаасацыяваным поліяміэлітам сярод дзетак, якія кантактавалі з прышчэпленымі жывой полівакцынай. Цяпер жа ў сувязі з пераходам на выкарыстанне ў нашай краіне інактываванай полівакцыны рызыка ўзнікнення такіх выпадкаў зведзена да нуля.

***— Падкажыце, ці маюць права адмовіць дзіцяці пры прыёме ў дзіцячы садок, калі ў таго няма прышчэпкі на рэакцыю Манту ці нейкіх іншых прышчэпак?***

— Прышчэпкі, якія ўваходзяць у Нацыянальны каляндар прышчэпак, абавязковыя, але без згоды бацькоў дзіцяці іх рабіць не будуць. Бацькі маюць права адмовіцца ад усіх ці ад асобных прышчэпак. Але ў гэтым выпадку яны павінны быць азнаёмленыя з наступствамі такога адказу. Урач-педыятр павінен паведаміць ім пра рызыкі ўзнікнення тых ці іншых інфекцыйных захворванняў і рызыкі развіцця ўскладненняў у выніку перанесенага захворвання.

Адсутнасць прышчэпак у немаўляці не паслужыць падставай, каб адмовіць яму ў прыёме ў дзіцячую ўстанову. Хіба толькі на час, калі ў гэтай установе будзе дзейнічаць каранцін па тым захворванні, ад якога дзіця не было абароненае з дапамогай прышчэпкі. Рэакцыя Манту не з'яўляецца прышчэпкай і з яе дапамогай не фарміруецца імунітэт супраць нейкага захворвання. Гэта дыягнастычная проба, неабходная для ранняга выяўлення інфіцыравання туберкулёзам. Яе адсутнасць таксама не паслужыць падставай для таго, каб адмовіць у прыёме ў дзіцячы садок. Аднак хацелася б параіць бацькам пры прыняцці рашэння аб правядзенні прышчэпак і пробы Манту ці адмове ад іх абапірацца ў першую чаргу на меркаванне прафесіяналаў — урача-педыятра, урача-эпідэміёлага ці ўрача-інфекцыяніста, якому яны давяраюць.

Падрыхтавала **Надзея НІКАЛАЕВА.**

Радавод

# Як «вырасціць» генеалагічнае дрэва

**Да якога калена ты можаш узгадаць сваіх продкаў? Ведаеш, як завуць прабабулю і ўсё? А магчыма, твае продкі былі знакамітымі людзьмі ў якім-небудзь XVII стагоддзі, можа, менавіта яны падпісвалі Статут ВКЛ, або ўдзельнічалі ў пераможнай Грунвальдскай бітве ці рукаліся з князем Вітаўтам? Адказы на гэтыя пытанні можна атрымаць, шукаючы свой радавод. З чаго і як пачынаць, чытайце далей.**



Герб шляхціца Андрэя СВІРКІ.

### У госці да бабуль-дзядуляў

Андрэю Філіпчыку 18. Студэнта першага курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачала цікавіць гісторыя сваёй сям'і з дзясятага класа. Цяпер у камп'ютарнай базе хлопца — каля 400 чалавек родзічаў. У сваіх пошуках Андрэй дайшоў да 1789 года.

Пачынаць пошукі хлопец раіць з роспытаў бацькоў, дзядуляў, бабуль. З тых, хто бліжэй за ўсё. Па словах Андрэя, аб продках да чацвёртага калена (г.зн. прапрадзедаў) яму расказалі бацькі, пра пятае — бабулі. Пасля ён звяртаўся да больш далёкіх родзічаў.

— Я, напрыклад, ездзіў у вёску Жыцькава пад Барысавам, дзе жыве сястра майго дзеда па мамінай лініі Мікалая Кругліка, — распавядае Андрэй. — Стрыечная бабуля паказала ваенныя лісты нашага прадзядулі. Ён знік без вестак пад Калінінградам літаральна за два месяцы да канца вайны. Цікава, што нягледзячы на канец вайны, у лістах прадзядуля пісаў, маўляў, і канца краю гэтай вайне не бачна.

Яшчэ можна паспытаць удачы на могілках. Яны шмат чаго могуць адкрыць, асабліва калі захаваліся ў добрым стане. Такім чынам Андрэй даведаўся імёны стрыечных дзядзькоў свайго прапрапрадзеда, а ўжо праз іх знайшоў дзядулю ў пятым калене.

Хібы інфармацыі ад родзічаў у тым, што часта не помняцца даты, імёны, блытаюцца падзеі і факты.

### На архіўныя раскопкі

У Беларусі тры рэспубліканскія архівы: Нацыянальны архіў, Нацыянальны гістарычны архіў у Мінску і ў Гродне. Дакументы, якія патрэбны для пошуку родзічаў, знаходзяцца пераважна ў Нацыянальным гістарычным архіве ў Мінску і ў Гродне.

Гэта рэвізскія казкі (перапіс сялян), метрычныя кнігі (вяліся пры цэрквах і касцёлах, у іх рэгістраваліся даты нараджэння, шлюбу, смерці), дакументы па генеалогіі дваранства і г.д. Існуюць таксама абласныя і раённыя архівы, але ў іх змяшчаецца інфармацыя з 1917 года.

Для самастойнай працы ў Нацыянальным гістарычным архіве вам неабходна будзе запоўніць заяву, заплаціць палову базавай велічыні (17 500). І атрымаеце магчымасць год бесперашкодна наведваць яго. Большасць дакументаў адкрытая для праглядаў простымі карыстальнікамі. Але ёсць і тыя, што знаходзяцца ў закрытых фондах, іх праглядаць не дазваляецца.

**Парады да самастойнага пошуку:**

**1.** Лепш завесці сшытак, дзе дакладна будуць запісвацца імёны, прозвішчы, даты нараджэння, смерці і г.д., каб пасля не блытацца ў разнастайных паперчынах.

**2.** Усе дакументы, фотаздымкі, лісты і іншыя прадметы лепей суправаджаць падрабязнымі апісаннямі. Запісвайце гісторыі, легенды, байкі, звязаныя з вашай сям'ёй.

**3.** Калі ёсць магчымасць, рабіце запісы на дыктафон ці відэакамеру.

**4.** Для стварэння базы зручна выкарыстоўваць камп'ютарныя праграмы. Іх можна бясплатна знайсці ў інтэрнэце.

Андрэй Філіпчык і яго радавод.



**Карысныя інтэрнэт-рэсурсы:**

http://niab.belhost.by/ — афіцыйны сайт Нацыянальнага гістарычнага архіва;

http://archives.gov.by/index.php?id=6 — архівы Рэспублікі Беларусь;

http://lists.memo.ru — ахвяры палітычнага тэрору ў СССР у перадваенны і ваенны часы;

http://www.obd-memorial.ru — прапалыя/загінулыя падчас ВАВ;

http://www.slavianrod.narod.ru — ёсць пералік нацыянальных архіваў Расіі, Украіны, Малдовы, Польшчы і г.д.;

http://www.onlinedisk.ru/file/89040/ — зручная праграма для пабудовы генеалагічнага дрэва;

http://www.petergen.com/metod/sovkrasko.shtml — парады пачаткоўцам;

http://www.nobility.by/forum/ — шляхецкі форум, можна пашукаць свае прозвішчы, стварыць для іх тэму;

http://vgd.ru — Усерасійскае Генеалагічнае Дрэва;

http://www.myheritage.com , http://www.eurekatree.com — можна пабудаваць дрэва анлайн.

— Асноўнымі напрамкамі майго пошуку былі метрычныя кнігі і рэвізскія казкі, — кажа Андрэй, — гэта дакументы, дзе запісвалі нашых продкаў. Асобна перапісвалі ваенных і яўрэяў. Калі ты ведаеш год пацвярджэння дваранства свайго роду, тады можна паспрабаваць пашукаць па дакументах, звязаных з дваранствам. У такім выпадку — гэта проста клондайк. Таму што там распісана яшчэ на тры-чатыры калены ўглыб. Напрыклад, Антоній Янкоўскі сын Пятра унук Франца праўнук Адама прапраўнук Сымона. Даходзяць звычайна да таго, каму першапачаткова выдалі дваранства.

У абласных архівах нашмат прасцей: плату за карыстанне не бяруць і па часе атрымання дакументаў — тут хутчэй. Сёння падаеш заяўку — заўтра можаш працаваць.

Яшчэ адзін кірунак пошуку — ЗАГСы. Але там патрэбны доказы роднасці. Каб знайсці дакументы, напрыклад, бабулі, патрэбна паказаць пасведчанні аб вашым нараджэнні і дакументы аб нараджэнні вашых бацькоў.

Самастойны пошук досыць марудны. Хутка і лёгка тут не атрымаецца.

— Першыя паўгода мне абсалютна не шанцавала, — апавядае Андрэй. — Было часам расчараванне, але кідаць не хацелася. Свой пошук у архіве я пачаў з Баляслава Янкоўскага, продка чацвёртага калена па мацярынскай лініі. Але вынікаў гэта не дало. Тады па бабуліных лініях прайшоўся, адшукаў шмат. Гэта мяне натхніла, і я вярнуўся да Янкоўскіх. Ізноў не пашанцавала. Пасля па іншых галінах знайшоў крыху інфармацыі. І нарэшце натрапіў на Янкоўскіх. Літаральна чатырох чалавек адкрыў, шчасця было вышэй галавы. Знайшоў і шляхту. Цяпер гэта, магчыма, і не мае такога значэння. Але калі бачыш, што твой продак запісаны як «шляхетна народжаны пан» Андрэй Свірка, гэта натхняе.

### Знайсці аднаго продка каштуе да 1 200 000 рублёў

Калі ў вас не хапае цярплівасці шукаць сваіх продкаў самастойна, можна замовіць пошук спецыялістам. Такія паслугі аказвае Нацыянальны гістарычны музей. Для гэтага патрэбна заява на імя дырэктара, у якой павінна быць указана ваша прозвішча і ініцыялы, грамадзянства і адрас пастаяннага месцажыхарства і гарантыі аплаты даследаванняў. У заяве таксама неабходна пералічыць усіх вядомых асобаў з вашай сям'і, хоць бы прыкладныя даты жыцця, смерці, магчыма, шлюбу, населены пункт, веравызнанне, род заняткаў. Калі вы хочаце атрымаць звесткі пра даты нараджэння, смерці, шлюбу вашых сваякоў — запыт будзе каштаваць крыху больш за 55 тыс. рублёў; патрэбна інфармацыя пра населены пункт, арганізацыю і інш. — да 400 тыс. рублёў; генеалагічны запыт, у залежнасці ад аб'ёмаў пошуку, будзе каштаваць беларускім грамадзянам да 1,2 млн рублёў. Перад пачаткам пошуку вы ўносіце перадаплату, якая не вяртаецца, калі раптам нічога не будзе знойдзена.

— Гэта не тое каб дорага, але нашы людзі не гатовыя столькі плаціць, — кажа Андрэй.

### Для чаго гэта робіцца?

— Уладзімір Арлоў у адным са сваіх эсэ згадваў, што ў славян быў такі звычай: для таго каб стаць сапраўдным мужчынам, патрэбна было пералічыць усіх сваіх продкаў да пятага калена, — тлумачыць Андрэй. — Вось я ведаю сваіх продкаў да сёмага калена. Адчуваеш, што ты не проста так жывеш, не проста аднекуль з'явіўся. Веданне радаводу дазваляе не губляць сувязяў. Цяпер родныя людзі раз'язджаюцца па ўсіх краінах свету, і вельмі важна не забываць сваіх каранёў.

**Настасся ЗАНЬКО.**

# МУЗЕЙ АДЧЫНІЎ ДЗВЕРЫ,

## ці Разважанні на патрыятычную тэму

**У гэтым месяцы ў школе в. Ніжняе Чэрніхава пад Баранавічамі быў адкрыты музей кінарэжысёра Міхаіла Пташука, а ў самім горадзе, на тэрыторыі вайсковай часці 54804, адчыніў дзверы музей імя першага Героя Рэспублікі Беларусь падпалкоўніка Уладзіміра Карвата. На гэтай падзеі я і сканцэнтрую сваю ўвагу, бо пра музей М. Пташука «Звязда» паведамляла.**

Уладзімір Карват, лётчык 61-й авіябазы, загінуў вечарам 23 мая 1996 года, калі не пакінуў самалёт, на якім узнік пажар, і адвёў знішчальнік ад населенага пункта. І вось праз 13 гадоў у в/ч, дзе лётчык служыў, адкрыўся музей яго імя.

Праўда, невялічкая экспазіцыя ў часці была, яна знаходзілася на трэцім паверсе ў невялікім пакойчыку, але было прынята рашэнне перавесці музей у прасторнае памяшканне і на гэта былі выдзелены грошы.

Кожны музей выконвае інфармацыйную і выхаваўчую функцыі — гэта своеасаблівае акно ў свет. І наколькі гэты свет вялікі, залежыць ад экспазіцыі музея.

Урачыстая частка прайшла на ўзроўні. На пляцоўцы перад музеем выстраіліся вайскоўцы, сярод якіх былі і тыя, хто служыў з У. Карватам. Пасля мітынгу прагучаў дзяржаўны гімн і настаў час пазнаёміцца з экспазіцыяй.

Неабходна сказаць, што стваральнікі экспазіцыі пастараліся, ім давялося «пералапаціць» вялікую колькасць матэрыялаў. На вялікіх планшэтах размешчана мноства фотаздымкаў, і каб пазнаёміцца з усёй інфармацыяй, патрэбен час.

Экспазіцыя складваецца прыкладна так: амаль палова яе адведзена авіяцыі Савецкага Саюза, затым гісторыі часці і пэўнае месца займаюць экспанаты і матэрыялы, звязаныя з жыццём першага Героя Беларусі. Падчас экскурсіі многа гаварылася аб патрыятычным выхаванні моладзі сёння і ў прыклад ставіўся савецкі перыяд жыцця.

Вось на гэтым моманце я і хачу спыніцца. Выхаваць з маладога чалавека патрыёта — задача няпростая і для нашай дзяржавы надзвычай важная. На мой погляд, патрыятызм неабходна шукаць найперш у нашай гісторыі (і тут не абысці савецкі перыяд), гераізме беларускага народа.

Будаваць усё на савецкім патрыятызме — гэта шлях у неакрэсленую будучыню. Савецкі патрыятызм, як і савецкі народ, аказаўся паняццем збіральным, бо калі б такі народ быў, ён не знік бы разам з былым Саюзам.

А ці не дзіўна, што мы ўхваляем патрыятызм дзяржавы, якой ужо няма на карце свету? Можна шкадаваць ці нават аплакваць распад Саюза, але яго ўжо не вярнуць. Але ж у нас ёсць Беларусь і, відавочна, на гераічныя старонкі савецкага перыяду неабходна глядзець праз прызму беларускасці, праектаваць іх на нашу краіну, беларускі народ.



Героя памятаюць.

На адкрыцці музея прысутнічаў Міхаіл Грыцавец — пляменнік двойчы Героя Савецкага Саюза лётчыка Сяргея Грыцаўца, ён пашкадаваў, што ў экспазіцыі не знайшлося месца для нашага земляка, які першым у былым Саюзе стаў двойчы Героем.

У Баранавічах ёсць помнік С. Грыцаўцу. Легендарны беларус нарадзіўся непадалёк ад горада, а пра яго забылі. І гэта ў той час, калі многім савецкім авіяканструктарам і яшчэ жывым ветэранам прысвяцілі цэлыя стэнды. Тут ні ў якім разе няма імкнення прынізіць заслугі тых людзей, інфармацыя пра якіх ёсць у музеі. Яны сваё слова сказалі і заслужылі пашану. Але кожная краіна абавязана выхоўваць патрыётаў, якія ведаюць свае карані. У Літве ў ганаровай варце стаяць воіны ў старадаўніх даспехах з дзідамі ў руках. У гэтай краіне выхоўваюць моладзь і на далёкай мінуўшчыне.

Мы бачым, як сёння любяць падлеткі, ды і не толькі яны, адзець кальчугі ды на нейкім мерапрыемстве разыграць эпізоды паядынкаў. Чаму на Грунвальдскай бітве нельга паказаць гераізм нашых продкаў? І калі ў вайсковай часці ёсць музей, то для маладых воінаў надзвычай цікава было б убачыць зброю і амуніцыю ваяра часоў Міндоўга ці Вітаўта. І ў наш час яе нескладана вырабіць.

Не трэба патрыятызм падаваць у палегчаным выглядзе. Савецкі перыяд — гэта толькі эпізод у гісторыі Беларусі, няхай сабе і важкі. Але і ён павінен быць завязаны на нашым жыцці. У суверэннай краіны — свой суверэнны патрыятызм, які не можа быць касмапалітычным.

Хіба на гераізме лётчыкаў С. Грыцаўца і У. Карвата нельга выхоўваць моладзь? Можна! І гэта будзе жывы кантакт, непарыўная сувязь пакаленняў, бо ёсць яшчэ родныя герояў, ёсць зямля дзе яны нарадзіліся, краіна... і гэта ўсё не абстрактнае, размытае часам. Але ў жыцці ўсё складаней, бо мы яшчэ духоўна звязаныя з краінай, якой няма. Многія з нас былі тады маладымі. А маладосць успамінаецца як найлепшы перыяд у жыцці.

Непрыкметна пройдзе час, у 61-й авіябазе не застанецца тых, хто служыў з Уладзімірам Карватам, і тады, найперш у музеі, можна будзе даведацца пра першага Героя Беларусі, убачыць яго рэчы: планшэт, шлем, кніжку пілота...

...Пасля адкрыцця музея ў вёсцы Арабаўшчына адбыўся мітынг, прысвечаны Уладзіміру Карвату, а на месцы гібелі лётчыка ўсклалі кветкі.

Была субота — сонечны веснавы дзень.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



Прыгажуні і пілоты.

Молочный Мир

# СТАЎКА НА ЯКАСЦЬ, НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І АПТЫМІЗМ

## Штрыхі да партрэта прадпрыемства, чыя прадукцыя не залежваецца на складах

*Аўтамабілі з бела-блакітнай эмблемай «Молочный Мир» сёння можна ўбачыць не толькі на дарогах Прынёманскага краю, але і ў сталіцы і іншых рэгіёнах Беларусі. Пры гэтым дастаткова пабываць у гродзенскіх крамах, каб пераканацца, што мясцовыя малакаперапрацоўшчыкі — зусім не манапалісты нават на сваёй тэрыторыі і працуюць ва ўмовах сур'ёзнай канкурэнцыі з іншымі вытворцамі. Прычым не скардзяцца, што сёй-той нават дэмпінгуе цэнамі, а па-майстэрску, творча выконваюць сваю работу. Чым і прываблiваюць пакупнікоў, якія сваім кашальком «галасуюць» за якасную, натуральную прадукцыю. У адваротным выпадку хіба ж удалося б дасягнуць проста выдатнага для нашага часу, які называецца крызісным, паказчыку па аб'ёмах вытворчасці за першы квартал: амаль 110 працэнтаў да мінулагодняга ўзроўню?*

### Другое «жыццё» сыроваткі. А марожанае — у Афрыку?

— Кожная праблемная сітуацыя ў эканоміцы дае нейкі штуршок да развіцця вытворчасці, і таму, як бы складана ні было, я стараюся ўсяліць у нашых работнікаў дух аптымізму, імкненне не спыняцца на дасягнутым, не проста акуратна выконваць свае працоўныя абавязкі, а думаць пра новае, перадавое. Бо ніхто нічога не зробіць за нас, — кажа **генеральны дырэктар ААТ «Молочный Мир» Іосіф ШЫШКО.** — І вынікі першага квартала гэтага года ў цэлым можна назваць станоўчымі. Аб'ёмы вытворчасці ў параўнанні з мінулым годам не скарацілі, а нават павялічылі (мы вельмі ўдзячныя за выдатную працу аграрнікам Гродзенскага, Бераставіцкага і Мастоўскага раёнаў, якія пастаўляюць нашаму камбінату 96 працэнтаў малака першага і вышэйшага гатункаў). Пры гэтым маем пэўны прыбытак — у сувязі з цэнаснай сітуацыяй на айчынным і замежных рынках ён, можа, і невялікі, але ж мы не стратныя. І прынцыпова важна тое, што ў нас няма прадукцыі, якая б залежвалася на складах. Працуем, як кажуць, з колаў, скарочаных працоўных дзён не ведаем і нават, калі ёсць заяўка на вялікую партыю прадукцыі, «прыхопліваем» ноч. Бо калі не зробім мы — гэта зробяць іншыя.

Дарэчы, наш кадравы склад сёлета ў першым квартале не толькі не скараціўся, а нават павялічыўся на 42 чалавекі. Мяркую, някепскі падарунак для горада ў цяперашніх эканамічных умовах.

**— А ці не зменшылася ў цяперашніх умовах ваша ўвага да падшэфнага сельгаспрадпрыемства «Агра Мір»?**

— Зроблена і робіцца цяпер там вельмі шмат. Купілі новую тэхніку, аднавілі вытворчыя аб'екты, стварылі нармальныя ўмовы для працы. Зразумела, фінансавыя затраты вялікія, але і вынік відавочны. Ураджайнасць збожжа, разам з кукурузай, летась дасягнула 70 цэнтнераў з гектара. Літаральна за два-тры гады надоі малака ўзраслі ў сярэднім з трох да шасці тысяч кілаграмаў ад каровы. Пры гэтым мы жывёл не мянялі, а проста іх як след накармілі, стварылі належныя ўмовы ўтрымання. Усе сянажныя траншэі (а кармы — гэта галоўнае) пераведзены на нармальную тэхналогію. З палёў сабралі тры тысячы тон камянёў, якія потым сваімі ж рукамі ўклалі ў бетон на шэрагу аб'ектаў. Дарэчы, зарплата ў работнікаў гаспадаркі павялічылася ўтрая.

**— Іосіф Вацлававіч, кошт малочнай прадукцыі ў айчынных крамах ужо некалькі месяцаў практычна не павялічваецца, экспартныя цэны — таксама. За кошт чаго ж «Молочный Мир» дабіваецца прыбытковых вынікаў працы?**

— Каля 45 працэнтаў у агульным аб'ёме нашай вытворчасці — сацыяльназначная прадукцыя, цэны на якую строга рэгулююцца і ўжо даўно, як можна бачыць, практычна не ўзрастаюць. А экспартныя цэны нават і скарачаюцца. І гэта пры тым, што кошт тары, розных дабавак і іншых камплектавых частак для нашай вытворчасці на месцы не стаіць, а пастаянна змяняецца ў бок павелічэння.

**— Кошт іх расце насуперак прагнозам некаторых эканамістаў аб зніжэнні цэнаў ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу...**

— Няхай прыедуць і паглядзяць, якая ж рэальная сітуацыя. Тым не менш, выйсце ў нас адно — трэба скарачаць затраты. Зразумела, бясконца рабіць гэта немагчыма, але наяўныя рэзервы імкнёмся выкарыстаць па максімуму. Рэжым жорсткай эканоміі (электраэнергіі, пары, вады, дапаможных матэрыялаў) датычыцца кожнага вытворчага падраздзялення і работніка. І, бадай, галоўнае — гэта замена абсталявання на больш высокапрадукцыйнае і менш энергаёмістае, укараненне нетрадыцыйных тэхналогій, новых відаў прадукцыі, упакоўкі, маркіроўкі.

**— З такімі праектамі «Молочнага Мира» нядаўна знаёміўся прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі...**

— Ужо цяпер можна сцвярджаць, што нанатэхналагічны праект глыбокай перапрацоўкі сыроваткі, які мы ажыццявілі летась, цалкам сябе апраўдвае. Раней гэтым адходам вытворчасці шмат увагі не надавалася. А сёння, дзякуючы сучаснаму і даволі хутка акупляльнаму абсталяванню, вырабляем у дзень 6 тон сухой сыроваткі, якая пашырае сваю прысутнасць на рынках, у тым ліку замежных, і выкарыстоўваецца не толькі ў нашай галіне, але і ў парфумернай, кандытарскай вытворчасці.

Гэта добра, канешне, што нам удалося мадэрнізаваць вытворчасць да пачатку крызісных з'яў у сусветнай эканоміцы. Але стаяць на месцы нельга, мы і сёння займаемся пошукам новых тэхналогій, абсталявання. У прыватнасці, усе нашы прадпрыемствы аснашчаны сучасным сыраварным абсталяваннем. А літаральна нядаўна ў Гродне, Скідалі і Бераставіцы ўстаноўлены высокаэфектыўныя лініі па нармалізацыі малака для вытворчасці сыру з дакладнай дазіроўкай тлушчу. Раней гэта рабілася ўручную, на вока, а цяпер дастаткова задаць камп'ютару адпаведныя параметры і, як кажуць, «ні ўправа, ні ўлева». А гэта — якасць прадукцыі.

Шкада толькі, што тэхпераўзбраенне даводзіцца праводзіць пры вельмі высокіх працэнтных стаўках па банкаўскіх крэдытах. За мінулы год мы заплацілі працэнтаў на паўтара мільярда рублёў, а сёлета за чатыры месяцы — ажно 1 мільярд 600 мільёнаў рублёў.

**— Як у сённяшніх эканамічных рэаліях не страціць існуючыя замежныя рынкі і заваяваць новыя?**

— За рэалізацыю прадукцыі павінны адказваць усе — ад генеральнага дырэктара да рабочага. І кожная партыя, якая адгружаецца і на ўнутраны рынак, і на экспарт, у нас пад самым пільным кантролем, каб нават да адной скрынкі з тысячы не было ніякіх заўваг ад спажыўцоў. Інакш рызыкуеш атрымаць такую «пілюлю», якую потым і не зможаш праглынуць.

Калі ж казаць канкрэтна аб нашай прысутнасці на замежных рынках, то ў Расіі, акрамя Масквы і Санкт-Пецярбурга, працуем з Ніжнім Ноўгарадам, Хабараўскам, Камсамольскам-на-Амуры. Таксама выходзім са сваёй прадукцыяй (сыр, сухое малако, сыроватка) на Казахстан, Азербайджан, Арменію, Малдову. Для гэтага ўкамплектавалі службу маркетынгу добрымі маладымі спецыялістамі з вышэйшай эканамічнай і юрыдычнай адукацыяй.

Дарэчы, марожанае мы разлічваем пастаўляць і ў Афрыку.

**— Нават з улікам транспартных расходаў гэта можа быць выгадна?**

— Так, і калі здолеем рэалізаваць такую ідэю — гэта будзе першая ластаўка ў афрыканскім кірунку.

**— Перш-наперш пакупнік звяртае ўвагу на назву прадукцыі — марожанае «Салдацкае», «Капеячнае»...**

— На фабрыцы марожанага ў нас працуе моладзевая каманда, якая пастаянна ў творчым пошуку. Вось і сёння, напрыклад, упершыню ў краіне запусцілі ў вытворчасць марожанае з ёгуртам. З павагай ставімся да даўнейшых тэхналогій (ніякай хіміі, а толькі натуральнае), але з выкарыстаннем новага абсталявання. У сезон рэалізуем штодзённа па Беларусі каля 15 тон марожанага, знаходзімся на вядучых пазіцыях у рэспубліцы. А наконт назваў... Праводзіцца конкурс, і таго, хто прыдумаў лепшую назву, прэміруем. Вырабілі і прадалі пэўную колькасць прадукцыі — таксама прэмія. А надалей «стаўкі», аб'ёмы для атрымання прэміі павялічваюцца.



1



2



3

### Як адна сям'я...

У Міжнародны дзень сям'і ў ААТ «Молочный Мир», дзе нядаўна была адчынена новая спартыўная зала, стартавала спартакіяда. Удзельнічаюць у ёй не толькі работнікі камбіната, але і члены іх сем'яў. «Як адна сям'я» — так можна сказаць і пра ўвесь калектыў прадпрыемства. Прычым гэта датычыцца і ветэранаў, якія ўжо на заслужаным адпачынку.

— Людзям, якія працавалі на прадпрыемстве 30 і больш гадоў, прысвойваецца ганаровае званне «Заслужаны работнік камбіната» з выплатай штомесячнага ўзнагароджання ў памеры 50 тысяч рублёў, расказвае **старшыня прафсаюзнага камітэта Людміла Кірэйчук.** — А тым, хто знаходзіцца на пенсіі, адпрацаваўшы ў нас 15 і больш гадоў, выплачваецца штомесячная прэмія ў суме 2 тысяч рублёў за кожны год працы. Наш генеральны дырэктар ведае пра лёс кожнага ветэрана, асабіста віншуе са святамі, юбілеямі, дапамагае ў складаных жыццёвых сітуацыях, напрыклад, у набыцці лекавых прэпаратаў.

— Нашы людзі і сапраўды сацыяльна абароненыя, — зазначае Людміла Кірэйчук. — Своечасова — аванс, зарплата, аплата па бальнічных лістах, лячэбная дапамога ў сувязі з водпускам. У вытворчых памяшканнях — высокая санітарная культура, усе ўмовы для высокапрадукцыйнай працы.

Дарэчы, не застаюцца без увагі і дзеці работнікаў камбіната. Студэнтам ВНУ, якія здалі сесію з сярэднім балам 8 і вышэй, штомесяц выплачваецца матэрыяльная дапамога ў памеры трох, а студэнтам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў — дзвюх базавых велічынь. Пры гэтым зусім неабавязкова вучыцца на работніка перапрацоўчай прамысловасці. Тых жа маладых спецыялістаў, хто выбраў менавіта гэты шлях, на ўрачыстым сходзе прымаюць у працоўную сям'ю ААТ «Молочный Мир» з уручэннем падарункаў. А далей, як кажа генеральны дырэктар Іосіф Шышко, трэба працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць. Добрасумленна, творча, згодна з правіламі і традыцыямі прадпрыемства.

*Летась гродзенскія малакаперапрацоўшчыкі атрымалі 11 ўзнагародаў на міжнародных і айчынных конкурсах. Сёлета гэта добрая традыцыя прадоўжылася.*

*Па выніках конкурсу-дэгустацыі «Лепшы прадукт-2008» у рамках міжнароднай выставы «ПРАДЭКСПА-2009» у Маскве ААТ «Молочный Мир» уручаны:*

*— Залаты медаль і Дыплом пераможцы за сыры сычужныя «Сметанковы», «Расійскі асаблівы», «Цільзіцкі».*

*— Сярэбраны медаль і Дыплом за сыры сычужныя «Расійскі асаблівы», «Белая Русь» Бераставіцкага масласырзавода, які ўваходзіць у склад таварыства.*

*— Бронзавы медаль і Дыплом за тварог 6-працэнтнай тлустасці ААТ «Молочный Мир».*

*Акрамя таго, прадпрыемства стала лаўрэатам конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2008 года Гродзенскай вобласці» ў сферы вытворчасці прадуктаў харчавання.*

**Публікацыю падрыхтавалі Барыс ПРАКОПЧЫК, Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Яраслаў ВАНЮКЕВІЧ (фота).**

УНП 500040357

**НА ЗДЫМКАХ:**

***1. Генеральны дырэктар ААТ «Молочный Мир» Іосіф ШЫШКО на ўчастку выспявання сыру.***

***2. На фабрыцы марожанага.***

***3. Намеснік галоўнага бухгалтара камбіната Наталля МАЦЭНКА і яе дачка Даша, дыпламант спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, пераможца другога міжнароднага конкурсу юных піяністаў імя Р. Шумана.***

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.51 | 21.23 | 16.32 |
| Віцебск — | 4.33 | 21.20 | 16.47 |
| Магілёў — | 4.41 | 21.13 | 16.32 |
| Гомель — | 4.46 | 21.01 | 16.15 |
| Брэст — | 5.08 | 21.37 | 16.29 |
| Гродна — | 5.17 | 21.29 | 16.12 |

**Месяц**

*Маладзік. Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**

**Пр.** *Ірыны, Аляксандра, Васіля, Георгія.*

**К.** *Паўліны, Эвеліны, Паўла.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




### Сутыкнуліся чатыры аўто

**У Смалявіцкім раёне на дарозе з-за таго, што кіроўца адной машыны няправільна выбраў хуткасць руху, у дарожна-транспартнае здарэнне трапілі адразу чатыры аўтамабілі.**

Паводле звестак УДАІ УУС Мінаблвыканкама, не справіўся з кіраваннем аўтамабіля «Опель-Амега» 20-гадовы кіроўца: ён сутыкнуўся з ВАЗ-21074, які рухаўся ў спадарожным напрамку. Пасля гэтага «Опель» выехаў на сустрэчную паласу, «праехаўся» па аўтамабілі «Фальксваген», а потым сутыкнуўся ў лоб з «Мерседэсам». У выніку цяжкія траўмы атрымаў кіроўца «Опеля». Пасажыр, які ехаў з ім, шпіталізаваны.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Дзве даты — 26 мая

**1919 год** — 90 гадоў з часу заснавання Навагрудскай беларускай гімназіі. Працавала ў Навагрудку ў 1919-1934 гадах. Гэта была сярэдняя навучальная ўстанова ў Заходняй Беларусі, якая падрыхтоўвала навучэнцаў да паступлення ў ВНУ. Выступала за захаванне беларускай нацыянальнай самабытнасці, павышэнне культурнага ўзроўню, выхаванне павагі да народных звычаяў і традыцый. Апроч беларусаў у гімназіі вучыліся рускія, татары, яўрэі. Утрымлівалася за кошт платы за навучанне, ахвяраванняў грамадскіх арганізацый, вулічных збораў і інш. Тэрмін навучання складаў 8 гадоў. Выкладаліся беларуская, польская, французская, нямецкая, лацінская мовы, Закон Божы, гісторыя і геаграфія Беларусі і Польшчы, сусветная гісторыя і геаграфія, матэматыка, фізіка, хімія, прыродазнаўства, маляванне, спевы, ручная праца, фізкультура і інш. Дзейнічалі аматарскія гурткі (танцавальны, літаратурны, драматычны, харавы, вакальны), аркестр, спартыўныя секцыі (па лёгкай атлетыцы, футболе, боксе, лыжная). Гімназія была закрыта польскімі ўладамі ў чэрвені 1934 г. Большасць навучэнцаў прадоўжылі вучобу ў Віленскай беларускай гімназіі, частка — у мясцовай польскай гімназіі імя А. Міцкевіча.



**1909 год** — нарадзіўся Эдзі Рознер, славуты нямецкі джазавы музыкант, трубач, кампазітар, заслужаны артыст Беларусі (1944). У 1933 годзе ўцёк з фашысцкай Германіі ў Польшчу, затым перабраўся ў СССР. З 1940 года — кіраўнік джаз-аркестра Беларусі. Рэпрэсаваны ў канцы 40-х гадоў. У 1973 годзе вярнуўся ў Германію. Аўтар многіх джазавых кампазіцый, танга, бліскучы імправізатар, за што яго называлі «белым Армстронгам».

**Цытата дня:**

*«Хто дурны, і зразумеў гэта, той ужо не дурань».*

**Публій Сір (I ст. да н.э.).**

### Фотафакт



Падчас крызісу зарабляць спрабуюць нават жывёлы. Гэты кот (а ніякіх гаспадароў побач не было), як бачым, напрацаваў на добрую бліскучую шкурку. Здымак зроблены на Камароўскім рынку ў нядзелю.

Фота Міколы ТАМАШЭВІЧА.

## КАМАР

Свет і сусвет чалавека

**Святую Лукер'ю (дзень ушанавання 26 мая) ў народзе звалі Камарніцай. Камар — насякомае, якое кусае чалавека і спажывае яго кроў. Менавіта таму чалавек ніколі не адчуваў вялікай любові да гэтага насякомага. У адным з паданняў расказваецца аб паходжанні мухі, камара і блыхі: «У насякомых ператвараліся агеньчыкі, якія разляталіся ад змяіных удараў хвастом па гарачых вуголлях. Іскра ад першага ўдара змяі, кінутай чалавекам у полымя, трапіла чалавеку на вусны і стала мухай. Змяя зноў стукнула хвастом, і агеньчык трапіў чалавеку на левую руку. Ён закрыў яго правай рукой і ўбачыў камара, якога ён, як і муху, выпусціў на волю. З апошняй іскры, якая трапіла чалавеку на лоб, утварылася блыха, пасля чаго змяя згарэла».**

- Нашы продкі звязвалі насякомых з тым, іншым светам, светам продкаў. Лічылася, што яны нясуць душу памерлага на «той» свет.
- Веснавыя камары ў сялян заўсёды выклікалі пачуццё радасці, таму што з іх з'яўленнем усталёўвалася доўгачаканае цяпло.
- У фальклорных тэкстах камар выступае гумарыстычным ці сатырычным персанажам, які надзелены мужчынскай сімволікай. Часта ў вясельных абрадавых песнях жаніха і нявесту параўноўваюць з камаром і мухай. Па народных уяўленнях, камар — гумарыст, добры музыка і танцор на вяселлі. Нездарма казалі: «У гэтым годзе камары джаляць балюча: злуюцца, што мала вяселляў».
- Па колькасці камароў прадказвалі не толькі надвор'е, але і вынікі збору ўраджаю: «Камароў мала — аўса і травы не будзе»; «Шмат камароў — рыхтуйся па ягады, шмат мошкі — шмат грыбоў».

**Абярэг перад тым, як зайсці ў лес**

*«Цар лесавы, царыца-лесавіца! Прымі ты наш падарак і нізкі паклон, і прымі ты маіх малых рабят і адпусьці іх дамоў, каб яны па лесу не плуталі, пад сасной не начавалі, шэрай калоды не елі, ключавой вады не пілі, да дому дахадзілі. А табе ў лясу спаць, з дзеткамі па пням хадзіць, з жаной на мху спаць, а маіх рабят у глаза не відаць. Амін».*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

☺

**Цешча з'ехала на дачу. Пачалося шчаслівае, але галоднае лета...**

☺

З жанчынамі «проста сябраваць» — гэта ўсё адно як на рыбалцы закідваць у рэчку вуду выключна для таго, каб глядзець на паплавок.

☺

**— Нядаўна ішоў каля цырка, выскоквае натоўп клоўнаў і давай мяне біць!**

**— Сур'ёзна?!**

**— А не, блін, усё з жартамі ды з прымаўкамі!..**

☺

— Як вы зарабілі такія грошы?

— Ну, для пачатку патрэбен стартавы капітал.

— А як вы зарабілі стартавы капітал?

— Ну, для пачатку патрэбен хоць стартавы пісталет...

☺

**Цешча пасылае зяця за гароднінай для салаты, просіць каб чыстая была, без нітратаў. Зяць зайшоў у краму, вядомую самай якаснай гароднінай, напоўніўшы пакеты, вырашыў удакладніць у прадаўшчыцы:**

**— Скажыце, гэтая гародніна без нітратаў і без усякіх атрутных рэчываў? Я цешчы іх нясу.**

**Прадаўшчыца:**

**— Без... Гэта вам, малады чалавек, самому трэба пакласці.**

☺

У маршрутцы жанчына — вадзіцелю.

— Спыніцеся мне, калі ласка, вунь там, дзе кошка.

— Вам каля задніх лап спыніцца, ці каля пярэдніх?



Фота БЕЛТА.

Кіназала

## Кінафестываль у Канах: «Белая стужка» на «Залатой галіне»

Пераможцам 62-га Канскага кінафестывалю, які завяршыўся ў мінулую нядзелю, стаў фільм аўстрыйскага рэжысёра Міхаэля Ханеке «Белая стужка». Гэта першая галоўная ўзнагарода рэжысёра, які ўжо ў шосты раз удзельнічаў у фестывальным конкурсе.

Дзеянне карціны, знятай у чорна-белым фармаце, адбываецца ў 1914 годзе ў нямецкай пратэстанцкай вёсцы, дзе здараецца шэраг загадкавых смярцей. Пад падазрэнне трапляе сям'я галоўнага героя, чый бацька — пастар — выхоўваў дзяцей вельмі, нават празмерна строга. Прынцыпы, якія навязвала маладым старэйшае пакаленне, паступова перайшлі ў аўтарытарныя догмы, і паміж бацькамі і дзецьмі ўтварылася сапраўдная бездань неразумення... «Я задумаў фільм каля 10 гадоў таму, спрабуючы зразумець прычыны таталітарнага грамадства, фашызму і фанатызму, — расказаў Міхаэль Ханеке падчас узнагароджання. — І прыйшоў да высновы, што карані гэтых бедаў знаходзяцца ў адным: узвядзенні ў абсалют тых прынцыпаў, якія першапачаткова маглі мець пазітыўныя бакі для грамадства».



**Да «Залатой галіны» Міхаэль ХАНЕКЕ ішоў больш як 10 гадоў.**

Другую па значнасці ўзнагароду — Гран-пры фестывалю — атрымаў французскі рэжысёр Жак Адзіяр за карціну «Прарок». Лепшым рэжысёрам журы назвала філіпінца Брыянтэ Мендоса, які прадставіў фільм «Кінатай», тытул лепшага акцёра дастаўся аўстрыйцу Крыстафу Вальтцу за ролю ў фільме Квенціна Таранціна «Бясслаўныя вырадкі», а лепшай актрысай стала француженка Шарлота Гензбур за ролю ў карціне Ларса фон Трыера «Антыхрыст». Што адметна, сам фільм экуменічнае журы Канскага фестывалю ўспрыняла рэзка адмоўна, прысудзіўшы яму галоўную антыпрэмію і назваўшы «самым жанчынаненавісніцкім фільмам». Падчас прагляду кінакрытыкі і журналісты фактычна абсвісталі гэту карціну, негатыўна ўспрыняўшы празмерную колькасць сцэн гвалту і жорсткасці.

Прыз журы фестывалю падзялілі паміж сабой дзве кінастужкі — «Акварыум» англічанкі Анрдэа Арнольд і «Смага» карэйскага рэжысёра Пак Чхан Ука. «Залатой кінакамерай» за лепшы дэбют быў адзначаны аўстраліец Уорвік Торнтан за карціну «Самсон і Даліла». Спецыяльнага прызу за заслугі перад кінематографам быў удастоены французскі рэжысёр Ален Рэне, які прадставіў стужку «Пустазелле».

Карціны расійскіх рэжысёраў сёлета былі прадэманстраваны ў Канах у конкурснай праграме «Асаблівы погляд» — на прызы ў ёй прэтэндавалі фільм «Цар» Паўла Лунгіна (у гэтым аповедзе пра царстванне Івана Грознага сыграў сваю апошнюю ролю Алег Янкоўскі) і «Казка пра цемру» Мікалая Хамерыкі. Аднак галоўная ўзнагарода праграмы ў выніку была прысуджаная рабоце грэка Ёргаса Ланцімаса «Клыкі».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**



**Парадыйны пераказ падзей Другой сусветнай вайны Квенцінам Таранціна канскую публіку расчараваў, але славу «Бясслаўныя вырадкі» ўсё ж прынеслі — праўда, не рэжысёру, а акцёру Крыстафу Вальтцу.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДКАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
**http://**www.zviazda.by;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2767. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**